ПРАЛЕТАРЫ УСЯХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі.

№ 103 (3211) Пятніца, 10-га Мая 1929 г.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

РАДЫЕ НАВІНЫ

РАДЫЕ НОЧЫ:

БЭРЛІН, 9. Учора адбылося пахаваньне ахвяр бэрлінскіх падзей. Рад прадпрыемстваў у гэты дзень не працавалі. У жалобным паходзе ўдзельнічала вялікая колькасьць народу, а таксама каля 200 дэлегацый. Ад імя КПГ з прамоваю выступіў т. Тэльман, які, спыніўшыся на злачынкай ролі с.-д. лідэраў, прызываў прысутных на пахаваньні рабочых шчыльней згуртаваць свае рады, каб у рашучы момант выступіць са зброяй у руках супроць буржуазіі і сацыял-фашыстых.

Пашырэньне заводу „Чырвоны Хэмік"

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Для здавальненьня ўзросшага попыту на прадукцыю прыступлена да пашырэньня заводу «Чырвоны Хэмік» у Нова-Беліцы. Усяго на будаўніцтва гэтага заводу адпускаецца 180 тысяч рублёў. Да будаўнічых работ будзе прыступлена 14—15 мая.

IX Усебеларускі зьезд саветаў

ДЭЛЕГАТЫ ЎХВАЛЯЮЦЬ ЛІНІЮ ЎРАДУ

Рашучая барацьба з капіталістычнымі элемэнтамі

— ВЯЛІКАЯ СПРАВАЗДАЧА АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ ЎРАДУ БССР, якую зрабіў тав. Галадзед на ўчорашнім раніпнім паседжаньні, выклікала жвавыя і дзелавыя спрэчкі з боку дэлегатаў.

— ВЫСТУПАЎШЫЯ Ў АСНОЎНЫМ УХВАЛЯЮЦЬ АГУЛЬНУЮ ЛІНІЮ ЎРАДУ І ПРЫЗНАЮЦЬ, ШТО за апошнія 2 гады Савецкая Беларусь пад кіраўніцтвам кампартыі дабілася вялізарных дасягненьняў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Разам з тым дэлегаты шчыра і сьмела крытыкавалі недахопы практычнай працы па ажыцьцяўленьні дырэктыў кампартыі і савецкай улады.

— ТАВ. ЦІХАНАЎ выказваецца за больш рашучае наступленьне на антысавецкія і капіталістычныя элемэнты ў вёсцы, бо яны ў значнай меры зьяўляюцца прычынай, якая перашкаджае сацыялістычнай перабудове вёскі. Ужо прайшло 12 год, як адбылася Кастрычнікавая Рэвалюцыя,—гаворыць тав. Ціханаў,—а яшчэ шмат былых абшарнікаў спакойна сядзяць на сваёй зямлі. Трэба ўрэшце пазбавіцца ад гэтага шкоднага для вёскі элемэнту і зямлю абшарнікаў перадаць беднаце.

Тав. Ціханаў лічыць недапушчальным панідаць у распараджэньні кучкі веруючых вялізарную колькасьць царквей, касьцёлаў і сінагог, якія пустуюць у той час, як не хапае памяшканьняў, дзе можна было-б праводзіць масавую культасьветную працу.

— НА РАД ВАЖНЫХ НЕДАХОПАЎ ЖЫЛЬЛЁВАГА БУДАЎНІЦТВА АДЗНАЧАЕ ТАВ. КУЛЬНІЧ. У выніку дрэннай і несвоячасовай падрыхтоўкі, гаворыць ён,—мы цярпімо вялікія страты; якасьць будаўніцтва нездавальняючая. Трэба нарэшце зьвярнуць увагу на гэтую асноўную прычыну недахопаў жыльлёвага будаўніцтва, трэба таксама ліквідаваць ажыятаж на рынку будаўнічых матар'ялаў.

—КАМІТЭТАМ УЗАЕМАДАПАМОГІ, якія ядлаюць больш 1.500.000 членаў і якія пасіны зьвяціца застрэльшчыкамі ў справе будаўніцтва калгасаў, сацыялізму ў нашай вёсцы да гэтай пары яшчэ не ўдзелена дастатковай увагі, а ў некаторых мясцох яны зусім забыты. У якасьці доказа, што такое становішча сапраўды існуе, тав. Масальскі прыводзіць наступны факт: у Полацкай акрузе 4 м-цы не змаглі «знайсьці» старшыню раёнага камітэту ўзаемадапамогі. На мясцох,—кажа дэлегат,—ніколі не ставіцца нават пытаньне аб тым, каб узмацніць працу камітэтаў.

— НАШ СЕЛЯНІН НЯ МОЖА ВЫЛЕЗЬЦІ З БАЛОТА,—ГАВОРЫЦЬ т. КАТЛІНСКАЯ і патрабуе ад ураду зьвярнуць максімум увагі справе мэліярацыі. Бюракратызм на мясцох,—гаворыць дэлегатка, кампрамэтуе ў вачох сялянства Савецкую ўладу. Барацьба з бюракратызмам вясковага апарату недастаткова рашучая. Асабліва нецярпімым зьяўляецца бюракратызм у нізавой каапэрацыі. Урад павінен зьвярнуць належную ўвагу на тое, каб каапэрацыя добра абслугоўвала патрэбы бядняцтва і батрацтва.

Нам не выканаць пасьпяхова задачу ўзьняцьця ўраджайнасьці, пакуль мы, ня зьнішчым вузкую сялянскую палоску. Даёш земляўпарадкаваньне, якое дасьць магчымасьць беднаце хутчэй разгарнуцца і ўзьняць сельскую гаспадарку, даёш шырокую калектыўную паласу!

— УЧОРА ПА ДАКЛАДУ ЎРАДУ ВЫКАЗАЛІСЯ ТАКСАМА НАСТУПНЫЯ ТАВАРЫШЫ: Сяргушкін, Верабэйчык, Брытка, Каралёва, Хахлоў, Бэнэк, Новік, Качук, Дземідовіч, Запінчанка, Шчацько.

— У ПАДАРУНАК ЗЬЕЗДУ СЯЛЯНЕ КОЙДАНАЎСКАГА РАЁНУ ПРЫСЛАЛІ ВАГОН ХЛЕБА. Дублікат на гэты вагон хлеба і прывітаньне ад імя сялян Койданаўскага раёну перадаў зьезду т. Руткоўскі.

— МАДЗЭЛЬ БРАНІРАВАНАЙ АЎТА. МАШЫНЫ І ПРЫВІТАНЬНЕ АД ІМЯ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ №-СКАГА КОРПУСУ Ў БАБРУЙСКУ перадаў зьезду чырвонаармеец т. Пружанскі.

УЧОРА ЗЬЕЗД ВІТАЛІ ДЭЛЕГАЦЫІ заводу «Бальшавік», калгасу «Ленінскі шлях» (Магілеўшчына), №-скай кавдывізіі.

ВАКОЛ ЗЬЕЗДУ

— У ЧАС АБЕДЗЕНАГА ПЕРАПЫНКУ ДЭЛЕГАТЫ зьезду, разьбіўшыся на групы, наведалі завод «Энэргія», Хлебазавод, Шпалерную фабрыку і іншыя прадпрыемствы Менску.

— ЗЬЕЗДУ БЫЎ ПАКАЗАНЫ НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ Белдзяржкіно «Хвоі шумяць».

— БЕЛДЗЯРЖКІНО ВЫПУСЬЦІЛА НОВЫ НУМАР КІНО-ХРОНІКІ, прысьвечаны IX усебеларускаму зьезду саветаў.

ПРЫВІТАНЬНІ АД ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ

Цэнтральнаму Камітэту ЎсеКП(б)

Арганізатару вялікага паўстаньня працоўных супроць эксплёататараў, тварцу Савецкай Беларусі, адзінаму правадыру і кіраўніку сацыялістычнага будаўніцтва, Усесаюзнай Камуністычнай партыі, у асобе яе Цэнтральнага Камітэту, IX Зьезд Саветаў БССР шле свае гарачае прывітаньне.

Зруйнаваная імпэрыялістычнай вайной і шматлікімі акупацыямі наша Беларусь змагла ўзьняць сваю гаспадарку і разьвіць сваю культуру толькі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву Камуністычнай партыі і братэрскай дапамозе Вялікага Савецкага Саюзу, непарыўнай часткай якога БССР зьяўляецца з першага дня яго стварэньня.

І цяпер, у момант пераможнага наступленьня сацыялізму супроць капіталістычных элемэнтаў на ўсіх франтох гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, рабочыя, сяляне і ўсе працоўныя нашай рэспублікі ня мысляць сабе іншага шляху да канчатковай перамогі, апрача шляху дыктатуры пралетарыяту, пад кіраўніцтвам сталёвай бальшавіцкай партыі, у шчыльным эканамічным, культурным і палітычным супрацоўніцтве з братэрскімі савецкімі рэспублікамі нашага адзінага СССР.

Цяжкасьці, што паўсталі перад намі і вынікаюць з умоў пэрыяду пачатай поўнай сацыялістычнай рэканструкцыі нашай народнай гаспадаркі, рашучага наступу на капіталістычныя элемэнты і абвостранай, у моц гэтых прычын, клясавай барацьбы ў краіне, нас не палохаюць. Пад выпрабаваным кіраўніцтвам партыі Леніна, усямерна ўзмацняючы дыктатуру пралетарыяту і абароназдольнасьць Савецкага Саюзу, мы пасьпяхова справімся з усімі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

Няхай жыве Ўсесаюзная Камуністычная партыя бальшавікоў!

Няхай жыве яе ленінскі ЦК!

Старшыня IX Усебеларускага Зьезду Саветаў А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар IX Усебеларускага Зьезду Саветаў А. ХАЦКЕВІЧ.

Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) Беларусі

IX Усебеларускі Зьезд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў пасылае сваё палкае прывітаньне Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі, сапраўднаму штабу бальшавізму БССР.

Азіраючы пройдзены шлях, падагульваючы дасягненьні, якія мае БССР за час свайго існаваньня, IX зьезд саветаў канстатуе, што вялікія посьпехі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляюцца вынікам напружанай барацьбы і працы рабоча-сялянскіх мас БССР пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі.

Камуністычная партыя Беларусі—адзін з баявых атрадаў Усесаюзнай Камуністычнай партыі, зьяўляецца авангардам і калектыўным правадыром у тэй вялікай барацьбе і перамогах, якія маюць працоўныя БССР як на франтох узброенага змаганьня за саветы, так і ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

IX зьезд саветаў Беларусі зьяўляецца адказьнейшым этапам на пераходзе да новай рэканструкцыі эпохі сацыялістычнага будаўніцтва, эпохі вялікіх работ, намечаных пяцігадовым фінансава-прамысловым плянам.

Зьезд адзначае, што працоўныя Савецкай Беларусі, краіны, абпаленай пажарамі і аблітай крывёю войнаў і рэвалюцыі, скончылі адбудову сваёй разбуранай гаспадаркі і сьмела перайшлі ў вялікае наступленьне да новых завяваньняў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, да індустрыялізацыі краіны, да калектывізацыі сельскае гаспадаркі, да культурнага будаўніцтва, уздыму дабрабыту працоўных.

IX зьезд саветаў выказвае ўпэўненасьць, што пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі пры дапамозе ўраду СССР працоўныя Савецкай Беларусі выканаюць тыя задачы, якія стаяць перад ёю на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, ня гледзячы ні на якія труднасьці.

Няхай жыве Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі, кіраўнік працоўных мас Беларусі ў іх барацьбе за пабудову сацыялізму!

Старшыня IX Усебеларускага Зьезду Саветаў А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар IX Усебеларускага Зьезду Саветаў А. ХАЦКЕВІЧ.

Нямецкі сацыял-фашызм адкрыта ўзбройваецца да грамадзянскай вайны

КОЖНЫ РАБОЧЫ ПАВІНЕН З ПАГАРДАЮ АДВЯРНУЦЦА АД САЦЫЯЛ-ФАШЫСЦКАЙ ПАРТЫІ ЗАБОЙЦ

Адозва ЦК кампартыі Нямеччыны

БЭРЛІН, 8. ЦК кампартыі Нямеччыны ў сваёй адозве да ўсіх нямецкіх рабочых, работніц і членаў кампартыі канстатуе, што «забарона сацыял-дэмакратамі Цэргібэлем, Гржэзінскім і Зэвэрынгам чырвонага саюзу франтавікоў і «Ротэ Фанэ» азначае, што сацыял-фашызм адкрыта ўзбройваецца для грамадзянскай вайны.

Адозва заклікае ўсіх нямецкіх рабочых да арганізацыі па ўсёй краіне сходаў і дэманстрацый з мэтаю паказаць, што нямецкі пралетарыят ня пойдзе на тое, каб яго бяз бою прадалі нямецкаму трэсставанаму капіталу. «З пагардай і з вялікай нянавісьцю павінен кожны нямецкі рабочы адвярнуцца ад сацыял-фашысцкай партыі забойц. Кожны рабочы, які да гэтага часу належыць да партыі катаў рабочае клясы і садзейнічае паняволеньню нямецкага пралетарыяту, робіць ганебнае здрадніцтва ў адносінах да пралетарыяту. Выходзьце з партыі сацыял-фашыстых і ўступайце масамі ў камуністычную партыю».

Адозва акрамя таго высоўвае лёзунг барацьбы за палітычную амністыю, а таксама зазначае на падрыхтоўку капіталістымі вайны супроць СССР. (ТАСС)

Расьсьледваньне першамайскіх падзей

БЭРЛІН, 8. Створаны камітэт публічнага расьсьледваньня першамайскіх падзей. У камітэце, акрамя кіруючых дзеячоў кампартыі, удзельнічаюць і прадстаўнікі лева-буржуазнай грамадзкасьці. Ліга праў чалавека таксама пастанавіла стварыць камісію для расьсьледваньня першамайскіх падзей, (ТАСС).

Тэрміновае запытаньне камдэпутатаў у рэхістагу

БЭРЛІН, 8. Камуністычныя дэпутаты рэйхстагу Тэльман і Леоў унесьлі ў рэйхстаг тэрміновае запытаньне па поваду забароны саюзу чырвоных франтавікоў. Яны канстатуюць, што ўгрунтаваньне забароны саюзу чырвоных франтавікоў спасыланьнем на закон аб правядзеньні ў жыцьцё вэрсальскага мірнага дагавору зьяўляецца надзвычайна паказальным для міжнароднага характару гэтага кроку. Гэта матывіроўка сьведчыць аб адкрыта выказанай гатоўнасьці прыняць удзел у ваенным паходзе, які падрыхтоўваецца супроць дзяржавы рабочых і сялян. Закон аб ахове рэспублікі, які у свой час, нібы меў на мэце абараніць яе ад правых, выкарыстоўваецца цяпер для прыдушэньня барацьбы рабочае клясы. (ТАСС).

Рабочыя дамагаюцца адстаўкі Цэргібэля

БЭРЛІН, 8 Пераважная колькасьць бэрлінскіх рабочых ухваліла на заводзкіх сходах рэзалюцыі, у якіх з абурэньнем пратэсуюць і асуджаюць варожыя рабочае клясы дзеяньні с.-д. паліцэй-прэзыдэнта. Рад заводзкіх рэзалюцый патрабуе ліквідацыі дыктатуры паліцыі і адстаўкі Цэргібэля. (ТАСС).

Звальненьні рабочых за забастоўкі-пратэсты

БЭРЛІН, 8. Бэрлінскія прадпрыемцы звольнілі ўжо 5000 рабочых і работніц якія ўдзельнічалі ў забастоўцы пратэсту ў майскія дні. Рэфармісцкія прафсаюзы зусім не рэагавалі на звальненьні. (ТАСС).

Адозва аўстрыйскае кампартыі

ВЕНА, 8. «Ротэ Фане» друкуе адозву аўстрыйскае кампартыі, якая заклікае пралетарыят Аўстрыі 8-га мая а 3 г. дня спыніць працу на ўсіх прадпрыемствах на 3 хвіліны в прычыны пахаваньня 24 ахвяр крывавых падзей у Бэрліне. Работа спыняецца ў адзнаку салідарнасьці аўстрыйскіх рабочых з нямецкім пралетарыятам у барацьбе супроць наступу міжнароднага фашызму, за савецкую Нямеччыну і за сусьветную рэвалюцыю.

Барацьба аўстрыйскіх рабочых супроць фашызму

ВЕНА, 7. Сацыял-дэмакратычны бурмістар Вены Зэйц забараніў усялякія працэсіі, якія наладжваюцца баявымі арганізацыямі на тэрыторыі Вены. Забарона—вынік нападу членаў арганізацыі хэймвэру на «рабочы дом» 5-га мая пасьля працэсіі членаў арганізацыі хэймвэру ў прамысловым горадзе Сакнт-Пэльтэне. Забарона выклікала бурныя рабочыя маніфэстацыі пратэсту. Жандары ў некаторых мясцох пусьцілі ў ход прыклады. 24 рабочых былі арыштаваны скаваныя адзін з другім і так былі праведзены па вуліцах.

Фашысцкія рабочыя машынабудаўнічага заводу Штокэраў учора звольнены з прычыны рашучае адмовы рабочых працаваць разам з фашыстымі. Рабочыя прадзільных фабрык у Нотэндорфе і Гюнзэльсдорфе і фабрыкі патронаў у Гіртэнбэргу абвясьцілі забастоўку пратэсту, патрабуючы звальненьня фашыстых. У Гіртэнбэргу работа адноўлена пастановаю рэфармісцкага сакратара прафсаюзаў.

Гэтая новая хваля антыфашысцкай барацьбы на прадпрыемствах прамысловых цэнтраў Ніжняй Аўстрыі знаходзіцца пераважна пад уплывам аўстрыйскае кампартыі.

Новыя арышты ў Баўгарыі

ВЕНА, 7. Як падае сафійскі друк, паліцыя па распараджэньню пракуратуры арыштавала 24 члены першамайскага камітэту за арганізацыю забароненых першамайскіх дэманстрацый. Сярод арыштаваных—члены ЦК рабочай партыі і саюзу рабочай моладзі, у тым ліку генэральны сакратар рабочай партыі Пецько Напетаў. Арыштаваныя абвінавачваюцца ў распаўсюджваньні антыдзяржаўных адозваў і ў падбухторваньні да непаслушэнства ўладзе.

Зварот дэлегацыі СССР з Жэнэвы

Дэлегацыя праехала ўчора праз Менск ў Маскву

(Гутарка спэцыяльнага карэспандэнта „Зьвязды" з членамі дэлегацыі)

Учора ўначы праехала праз Негарэлае ў Маскву дэлегацыя СССР на 6 сэсіі падрыхтоўчай камісіі па разброеньні ў Жэнэве.

У гутарцы са спэцыяльным карэспандэнтам «Зьвязды» генэральны сакратар дэлегацыі тав. Штэйн паведаміў наступнае:

— На сэсіі разглядаўся другі савецкі праект па прапарцыянальным скарачэньні ўзброеньняў. Гэты праект, як вядома, быў унесены савецкай дэлегацыяй яшчэ на 5 сэсіі камісіі ў сакавіку 1928 г., пасьля таго, як тая-ж падрыхтоўчая камісія адхіліла першы савецкі праект аб агульным і поўным разброеньні.

Другі савецкі праект не разглядаўся камісіяй на працягу 13 месяцаў, бо за гэты час жэнэўскія «міратворцы» ўпарта не жадалі склікаць камісію. Калі камісія, нарэшце, была склікана 15 красавіка гэтага году, склікана ў значнай меры дзякуючы патрабаваньню т. Літвінава, які двойчы зварачаўся да старшыні камісіі Лёўдона з патрабаваньнем аб яе скліканьні, савецкі праект павінен быў быць пастаўлены на абгаварэньні.

Як і ў мінулым годзе, савецкая дэлегацыя патрабавала адкрытага абгаварэньня свайго праекту і пасьля дыскусіі рубам паставіла перад камісіяй пытаньне аб тым, ці хоча яна сапраўды выпрацаваць праект зьдзейсьненага скарачэньня ўзброеньняў, або не.

Тры пункты, сфармуляваныя савецкай дэлегацыяй, паставілі камісію ў тупік. Адказаць на гэтыя пункты станоўча, значыла-б прыняць асноўныя прынцыпы савецкага праекту. Адказаць на іх адмоўна значыла-б выкрыць сябе перад усім сьветам і адкрыта прызнацца ў нежданьні ісьці на якое-б ні было разброеньне. Камісія ўжыла максымум вываротлівасьці дзеля таго, каб ухіліцца ад прамога і яскравага адказу.

Аднак, іменна гэтая вываротлівасьць і выкрывала яе.

Савецкі праект быў адхілен, як і належала чакаць, прычым камісія паставіла перадаць яго на абгаварэньне канфэрэнцыі па разброеньні. Пасьля гэтага камісія перайшла да другога чытаньня яе ўласнага праекту.

Пасьля адхіленьня савецкага праекту савецкая дэлегацыя не пакінула Жэнэву, а засталася там для таго, каб пры дапамозе паасобных паправак да праекту выяўляць сапраўдныя намеры кіраўнікоў камісіі. Гэтая тактыка савецкае дэлегацыі дала добрыя вынікі.

Савецкая дэлегацыя і толькі яна зьяўлялася ў Жэнэвы адзінай пасьлядоўнай абаронцай міру і працаўнікам вайны.

Трэба адзначыць, што пасьля другога чытаньня праект камісіі вышаў у яшчэ больш уродлівым выглядзе, чым 2 гады таму назад. Ад праекту засталося некалькі нічога не абазначаючых артыкулаў, якія ні адным словам не гавораць аб якім бы-та ні было скарачэньні ўзброеньняў.

Пад канец кіраўнікі камісіі прыбеглі да нікчэмнай увёрткі, абвясьціўшы б сэсію няскончанай, прычым тэрмін яе працягу застаўся ня вызначаны. Старшыні камісіі даручана склікаць яе пасьля таго, як асноўныя марскія дзяржавы (Амэрыка, Англія, Францыя, Італія і Японія) прыдуць паміж сабой да згоды па пытаньні аб марскіх узброеньнях. Калі-ж гэта будзе ніхто ня можа сказаць, роўна, як ніхто ня можа сказаць, ці прыдуць яны наогул да згоды.

Так у Жэнэве абгаворваюцца і вырашаюцца пытаньні міру і разброеньня.

Савецкая дэлегацыя ня мела ілюзій адносна выніку гэтай сэсіі, як ня мела ілюзій адносна ўсёй дзейнасьці жэнэўскіх «міратворцаў».

Яна дала ў Жэнэве новы доказ шырачэйшай намеру савецкага ўраду ў галіне разброеньня.

Яна перад тварам шырокіх народных мас зноў паказала, хто стаіць за мір і хто за вайну, хто за разброеньне і хто за далейшы шалёны тэмп узбраеньняў, якія вядуць чалавецтва да новай бойні.

М. К—н.

НА УРАЛЕ ЗНОЙДЗЕНА НАФТА

ВСНГ СССР атрымаў паведамленьне:

— На Урале знойдзена нафта.

Гэтае паведамленьне мае надзвычайна важнае значэньне ня толькі для уральскае прамысловасьці, але і для ўсяе гаспадаркі СССР. Уральскія заводы дагэтуль апальваліся, галоўным чынам, дрывамі. Дровы—самы прымітыўны і дарагі спосаб апалу.

Нафта была выкрыта выпадкова. У 50 кілёмэтраў ад Пермі, каля Чусавой, нейкі час таму назад былі пачаты разьведкі—меркавалі знайсьці залежы калійных соляй. У часе сьвідраваньня рабочыя пачулі пах нафты. Парода была паслана на досьлед. Спэцыялісты знайшлі ў шчылінках пароды нафту.

Сьвідравалі далей. Хутка зьявілася нафта.

Начальнік нафтавага дырэктарату ВСНГ СССР тав. Салаўёў паведаміў, што знаходка нафты на Урале не зьяўляецца нечаканасьцю.

Паводле першых вестак яшчэ трудна меркаваць, якая магутнасьць новых крыніц нафты. Аднак, з упэўненасьцю можна сказаць, што гэта знаходка дасьць уральскай прамысловасьці не малую колькасьць нафты.

На Урал прыходзіцца весьці нафту, бэнзыну, і газу за многія тысячы кілёмэтраў, з Баку. Гэта значна ўдаражае і нафту і прадукцыю уральскіх заводаў.

Калі разьведкі дадуць станоўчыя вынікі і нафты на Урале будзе вялікая колькасьць, дык і Сібір зможа апальвацца уральскаю нафтаю.

Выкрыцьцё нафты—новая эпоха для уральскае прамысловасьці. Яна зможа разьвівацца значна шпарчэй, чым дагэтуль.

Галадоўка палітзьняволеных у Баўгарыі

Як паведамляюць з Бухарэсту 63 арыштаваных камуністых, якія знаходзяцца ў розных турмах Баўгарыі ўжо 5-й дзень працягваюць галадоўку пратэсту супроць выключэньня іх з-пад амністыі, абвяшчэньне якое чакаецца 10 мая.

Аб'яднаньне сацыял-згодніка ў

ВАРШАВА. 3. Цэнтральная камісія клясавых прафсаюзаў (пэпэсаўсіх) дагаварылася з украінскімі прафсаюзамі, якія кіруюцца Украінскай сацыял-дэмакратычнай партыяй, аб уваходзе апошніх у цэнтральную камісію. („Роб.").

Як нямецкія сацыял-здраднікі стралялі ў рабочых 1-га мая



БАРЫКАДЫ І БРАНЯВІКІ НА ВУЛІЦАХ БЭРЛІНУ. «ГЭРАІЧНЫЯ ЎЧЫНКІ» САЦЫЯЛ-ФАШЫСЦКІХ ЖАНДАРАЎ

Наперакор грозным загадам «сацыялістых» Гржэзінскага і Цэргібэля, пралетарыят Бэрліну яшчэ задоўга да 1-га мая распачаў барацьбу за «права на вуліцу» у дзень рабочага сьвята. Першапачатковы плян дэманстрацыі зводзіўся да наступнага. Меркавалася сканцэнтраваць шэствіе дэманстрантаў на двух пляцох—Аляксандарплятц і Постдамерплятц. Аднак, паліцыя ўжо з раніцы 1-га мая пачала разганяць нават невялікія групкі дэманстрантаў. К паўдню горад быў літаральна заняты шматлікімі атрадамі паліцыі, якія разганялі дэманстрантаў. Вялікія кардоны паліцыі былі ўстаноўлены на пляцох і пераважна ў рабочых раёнах.

Аднак, ня гледзячы на ўсе спробы паліцыі, дэманстрантам ўсё-ж удалося прарваць фронт «блюстителей порядка» і прабрацца на Постдамерплятц і Александарплятц. Паліцыя пусьціла ў ход гумавыя палкі. Жорсткасьць паліцыі выклікала моцнае абурэньне сярод рабочых і прымусіла іх зьвярнуцца да мер самаабароны. У рабочых раёнах стыхійна пачалі будавацца барыкады з павозак, скрынь, грузавікоў і г. д. Завязалася перастрэлка. К вечару разгарэлася ажыўленая кананада. Гэта паслужыла пачаткам жорсткіх баёў. Нічога падобнага Бэрлін ня бачыў з часоў спартакаўскага паўстаньня ў 1919 годзе.

Цэнтрам баявых дзеяньняў былі пралетарскія раёны—Вэдынг, які буржуазныя газэты са злосьцю называюць «зборышчам прыхільнікаў Макса Гельца і кампаніі», Нэйкельн, а таксама цэнтральныя раёны і прадмесьце Ліхтэнбэрг.

К вечару 1-га мая бай ў рабочых раёнах набылі характар рэгулярных ваенных дзеяньняў. Жандары выклікалі спэцыяльны бранявік, забясьпечаны кулямётамі і пражэктарамі. У рабочых раёнах былі сьцягнуты значныя паліцэйскія сілы пад непасрэдным кіраўніцтвам аднаго з вышэйшых чыноў паліцыі палкоўніка Геймансбэрга. У выніку моцнай перастрэлкі забіта і паранена шмат рабочых, у тым ліку жанчыны і дзеці.

Няменшую «энэргію і гэройства», паводле выразу сацыял-дэмакратычных газэт, праявіла паліцыя і ў другім рабочым раёне—Нэйкельне.

НАПЯРЭДАДНІ 1-га МАЯ Ў БЭРЛІНЕ

Да апошняга часу многія чакалі, што Цэргібэль скасуе забарону дэманстрацыі. Аднак, гэта ня здарылася. Наадварот, падзеі напярэдадні 1-га мая паказалі, што Цэргібэль задумаў шырокую правакацыю. Увечары 30-га красавіка паліцыя ў Нэйкельне і на Гэнрыхплятцы напала на мірных дэманстрантаў. Адбылася перастрэлка, прычым паводле афіцыйнага паведамленьня паліцыі, першымі нібы пачалі страляць рабочыя. Пры дапамозе такіх паведамленьняў Цэргібэль спрабаваў расчысьціць шлях для наступных правакацый і апраўдаць крывавую лазьню, якая падрыхтоўвалася.

Што Цэргібэль рыхтаваў крывавую лазьню, аб гэтым гавораць таксама вынікі нарады кіраўнікоў палітычнай паліцыі і «шупо» (жандармэрыя), якая адбылася напярэдадні 1-га мая. На гэтай нарадзе быў выпрацаваны плян дзеяньняў супроць бэрлінскага пралетарыяту.

Крывавыя ўчынкі нямецкіх сацыял-дэмакратаў у першамайскія дні 1929 г.

На МАЛЮНКАХ ЗНАЧЫЦЦА: 1), 2), 3) і 4)— Цэргібэлеўская гвардыя на броневі́ках і пешшу з гумавымі палкамі, кулямётамі і пажарнымі помпамі нападае на рабочых. 5) Рабочыя абараняюцца. Ляжыць перавернаны мэбляваны воз для абароны ад шалёных атакаў Цэргібэлеўскай гвардыі. 6) Цэргібэль—сацыял-дэмакрат—старшыня паліцэйскай управы г. Бэрліну. 7) Рабочыя несуць параненага таварыша. 8) Брані́раваны аўтамабіль кулямётным агнём бароў барыкады. 9) Барыкады на вуліцы. Малюнкі ўзятыя з нямецкай камуністычнай газэты.

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ СУТЫЧАК У НЭЙКЭЛЬНЕ І Ў ВЭДЫНГУ

З раніцы 1-га мая Нэйкэльн прадстаўляў сабой такі-ж малюнак, як звычайна ў рабочыя дні. Толькі па шматлікіх патрулях шупо (жандармэрыя) можна было заключыць, што забарона дэманстрацыі ўсё яшчэ мае моц.

А гадзіне 10-й на пляцох пачалі зьбірацца рабочыя. У кароткі тэрмін тратуары запоўніліся народам, але шупо была тут як тут. Вакол Рэйтэрплятца было выстаўлена ацапленьне. Было відаць, што паліцэйскія чыны і жандары рыхтуюцца да «маладзецкай» атакі на мірных абыхароў. Натоўп захваляваўся.

Словы каманды. Свісткі. На галавы няўзброеных людзей пасыпаўся град ударaў. У паветры мільгалі гумавыя палкі. Людзі заметусіліся Тых, хто ўцякаў, прасьледвалі жандары, зьбіваючы іх на хаду дубінкамі. Усё гэта пакрывалася ўрывачнымі словамі камандуючых афіцэраў.

Каля бровару Кіндэля адбывалася дэманстрацыя. Дэманстрантаў атакавалі ў конным строі.

Без страляніны ў гэты дзень не абышлося. Паліцыя страляла ў безабаронных людзей на Гэрманплятцы, на Рэйтэрплятцы, ля Котбускіх брам і на Хазэнхэйдзе. Праз некалькі гадзін Гэрманштрасе зрабіляся арэнай абстрэлу натоўпу залпамі. Страляніна працягвалася да позьняй ночы, галоўным чынам, на Штэймэцштрасэ і суседніх вуліцах. Там, як з пад зямлі, вырасьлі барыкады з булыжнікаў і зваленых дрэў. Паводле слоў відавочцаў, у гэтых мясцох адбывалася сапраўднае сражэньне, якое скончылася каля 11 гадзін ночы, калі на сцэне зьявіўся бранявік.

Камічны эпізод. Праз вуліцу, на якой збойства прахожых было ў поўным разгары, прабіраецца нейкая асоба. Паліцэйскі хапае яе за каўнер. Асоба пратэсту е і атрымлівае моцны ўдар. Чуцен піск: «ды я-ж сацыял-дэмакрат», але і сацыял-дэмакрату прышлося пазнацца з ударамі, бо разьюшанаму жандару было ў вышэйшай ступені наплываць на партыйную прыналежнасьць тых, хто трапіў яму ў рукі.

У Вэдынгу падзеі разьвіваліся ў тойжа пасьлядоўнасьці, У жандараў часаліся рукі. Яны нападалі без усякага да таго поваду і ўсякі раз з такой разьюшанасьцю і грубасьцю, якая перавышае ўсё, што можна сабе ўявіць.

У поўдзень у ваколіцах раённага вакзалу паліцыя цкавала прахожых, як дзікіх зьвяроў. Усюды, дзе зьбіралася некалькі чалавек, якія мірна гутарылі, паліцэйскія саскаквалі з грузавіка і пускалі ў ход гумавыя палкі. Дзяўчыны, жанчыны і дзеці кідаліся ўцякаць, як ад дзікіх зьвяроў.

ДРУГОГА МАЯ Ў РАБОЧЫХ РАЁНАХ

З 5 гадз. раніцы стан аблогі на Кезлінэрштрасэ часова адмяняецца. Вуліцы запруджаны сотнямі рабочых, якія ажыўлена абгаворваюць падзеі ўчарайшага дня. На дамох відаць яшчэ сьлады ўчарайшае страляніны. То тут, то там адсутнічае штукатурка, фасады будынкаў прадзіраўлены кулямі. Ды гэта і ня дзіва. Рабочыя раёны былі цэнтрам кулямётнае кананады.

Цяжкое ўражаньне робяць вуліцы рабочага раёну Нэйкэльна. Тут паліцыя страляла да 4 гадз. ночы 1-га мая. На вуліцах ляжаць рэшткі барыкад—сходкі і дрэвы. Амаль усе шыбы ў вокнах выбіты кулямі. Рабочыя перадаюць жудасныя падрабязнасьці паліцэйскага гвалту. Адзін рабочы забіт у ложку выпадковай куляй. На Германштрасэ 51 рабочы «выпадкова» паранены ў жывот. З асаблівым абурэньнем рабочыя апавядаюць аб грубых адносінах «шупо» да дзяцей і жанчын. Паводле слоў відавочцаў, паліцэйскія павалілі адну жанчыну і за ногі валаклі яе па вуліцы.

Газэта «Вэльт ам Абэнд» падагульвае ныя вынікі майскім падзеям, піша:

«Крывавы пасеў Цэргібэля даў усходы. 1-га мая ў Бэрліне зрабілася сапраўдная оргія паліцыі. Трупы рабочых—абвінавачаньне супроць Цэргібэля. І першы яго абвінаваўца, гэта труп аднаго сацыял-дэмакратычнага рабочага—члена «рэйхсбанэра», які ў сваёй кватэры быў забіты паліцэйскай куляй. Ён быў першай ахвярай майскіх падзей.

Сотні тысяч пралетараў дэманстравалі 1-га мая на вуліцах Бэрліну. Яны даказалі, што будуць змагацца супроць сацыялістычных міністраў, якія забараняюць дэманстрацыі, з такой-жа сілай, як і супроць вільгэльмаўскіх міністраў. Ніколі Бэрлін ня бачыў такога шаленства паліцыі, як зараз, у часы Цэргібэля і Гржэзінскага.

Вастрожны друк у Заходняй Беларусі

У Зах. Беларусі сядзіць у вастрогах вялікая армія рэвалюцыянэраў—да 3-х тысяч палітычных вязьняў. Армія гэта ўсьцяж папаўняецца праз фашысцкі рэжым, які вядзе жорсткае і дзікае прасьледваньне, нават найменшай праявы масавага руху. Рэдка ёсьць рабочая сям'я, бадай няма тэй вёскі, якая не адчула-б жаху паліцэйскіх рэпрэсій, якая не атрымала-б удару белага тэрору.

Палажэньне палітвязьняў надзвычайна цяжкое. Вось жудасныя лічбы, якія ілюструюць палажэньне налоньнікаў капіталу. Горадзенская вастрожная часопісь «Вастрожныя думкі» падае, што ў Горадні на 210 палітвязьняў у 1927 годзе хворых 142, на Лукішках па 102 хворыя 91 пераважна хварэе на сухоты (70 проц.). Вастрожны рэжым пры фашызьме значна пагоршыўся. Фактычна рэжым гэты мае на мэце зламаць рэвалюцыйную волю палітвязьняў і падпарадкаваць іх загадам фашызму, а непакорных зьвесьці са сьвету, зьнішчыць. Тая-ж часопісь падае, што з горадзенкіх палітвязьняў нябітых толькі 21 на 210, а на Лукішках 38 на 102.

Ня толькі фізычнымі мукамі, але подкупамі, пагрозамі, правакацыяй і іншымі дэфэнзыўнымі спосабамі хоча фашызм зламаць рэвалюцыйную волю, хоча змусіць барацьбітоў стаць здрадзікамі, правакатарамі або рабамі.

Тысячы актыўнейшых рабочых і сялян Зах. Беларусі гібне па вастрогах, засуджаныя на доўгія гады катаргі. Гэта армія гэрояў стойка з рэвалюцыйнай годнасьцю перанесла і пераносіць інквізыцыі польскай дэфэнзывы. Яны, закаваныя за кратамі ў каменных мяшкох, ня спыняюць клясавай барацьбы, з гордасьцю трымаюць чырвоны сьцяг, вераць у перамогу.

Цяпер у вастрогах Зах. Беларусі, як і ва ўсёй Польшчы, палітычныя вязьні вядуць надзвычайна зацятую барацьбу супроць пагоршаньня іх становішча. Галадоўкі і так званыя бунты па вастрогах—цяпер пастаяннае зьявішча. Апрача таго, палітвязьні прымаюць актыўнейшы ўдзел, наколькі гэта ім магчыма, ва ўсіх кампаніях партыі і палітычных падзеях. Палітвязьні сваімі абмежаванымі магчымасьцямі і сродкамі пры пастаянным прасьледваньні адміністрацыі вядуць рэвалюцыйную марксыцкую самаадукацыю. Маюць свае розныя гурткі, выдаюць свае падпольныя часопісі як «Лукіскі сьцяг» «Вастрожныя думкі» (у Горадні) і іншых.

У выніку палітвязень выходзіць з вастрогу яшчэ больш загартаваны барацьбой, падкаваны рэвалюцыйнай тэорыяй, распалены клясавай нянавісьцю. Не дарма існуе на Зах. Беларусі ходкая пагаворка: турма—наш унівэрсытэт.

Перад намі адна з падпольных вастрожных часопісяй «Лукіскі Сьцяг», выдаваная закаванымі гэроямі ў вядомым віленскім вастрозе Лукішкі.

Гэта невялічкі (13×8 см.) сшытак на гільзавай паперы, у 50 старонак, акуратна збрашураваны. На вокладцы віньетка, якая прадстаўляе закратаванае вакно, а ў глыбі на цёмным фоне відзён падпіс «Лукіскі Сьцяг». Часопісь пісана ад рукі пад друк і настолькі дробна, што па размеры будзе як пэтыт. Выдана ў лістападзе 1925 г. пабеларуску, № 2.

Першыя два багата тэарытычныя артыкулы пісаны моцнымі марксыстымі, другія разглядаюць пытаньні бягучага моманту з пункту гледжаньня інтарэсаў прадоўнай масы. Трэба адзначыць поўную азнаёмленасьць аб палітычных падзеях як у краі, так і за межамі, а таксама багацьце лічбовых даных.

У «літаратурным кутку» знаходзім цікавыя ўспаміны рэвалюцыянэра, які сядзеў у 1905 г. разам з Бурбісам, Алесем Гаруном, Коласам і іншымі.

Карэспандэнцыя з Горадзенскай турмы апавядае, як турэмны доктар, стары ўжо чалавек, пакончыў самагубствам, бо ня мог далей бачыць зьдзекаў і гвалтаў турэмнай адміністрацыі над палітычнымі вязьнямі. У прасьмертным лісьце кажа, як яго прасьледвалі за сумленныя адносіны і за данамогу хворым вязьням.

— Турма, гэта не санаторы. У турме трэба лячыць «іначай»,—папракаў яго начальнік турмы.

З жыцьця Лукіскай турмы чытаем, як працякала галадоўка—пратэст супроць вядомага катаваньня арыштаваных у Ландварове. У гэты-ж час паведваў Лукішкі праежджы францускі парляментар, паведваў у поўнач, калі вязьні ўсе спалі. «Важны госьць» прайшоўся па вымытых калідорах, ну і, зразумела, застаўся здаволеным «парадкамі».

«Лукіскі Сьцяг» паведамляе, што Мурашка, забойца Багінскага і Вечаркевіча, сядзіць у выгоднай камэры з вялікім камфортам. Як стопроцантнаму патрыёту, яму даручана цэнзура газэт, што прысылаюцца палітычным вязьням. Пасьля такой цэнзуры застаюцца заўсёды бадай адны абвесткі ды хропіка. Рэшту гэрой панскай Польшчы неміласэрна выразае.

Такога самага зьместу выходзіць «Лукіскі Сьцяг» і па яўрэйскай мове.

Сярод крывавых старонках бытаваньня працоўных мас Зах. Беларусі, старонак, якія прасякнуты пячуванай эксплёатацыяй і ўціскам, захапляе гэта палкасьць рэвалюцыйнай ідэі, сіла волі і адважнае імкненьне да зорак камуністычнага ладу змаганьнікаў закаваных гэрояў.

Ан. Ст.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Наўхільна выконваць пастановы XVI партканфэрэнцыі

Правыя затрудняюць перамогу над цяжкасьцямі сацыялістычнай рэканструкцыі

Да пачатку генэральнай чысткі партыі—выправіць недахваты ў падрыхтоўчай рабоце

За генэральную лінію партыі

Жорстка ўдарым па правых укланістых, што капітулююць перад кулацка-нэпманскімі элемэнтамі гораду і вёскі

— Заслухаўшы даклад тав. Астапенка аб выніках XVI партканфэрэнцыі, агульны сход Мазырскай арганізацыі КП(б)Б цалкам і поўнасьцю ўхваляе ўсе пастановы канфэрэнцыі і далучаецца да іх.

Сход лічыць, што толькі ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі на індустрыялізацыю краіны, на будаўніцтва саўгасаў і калектывізацыю сельскае гаспадаркі забясьпечыць перамогу сацыялізму ў СССР.

— Партыя рашуча асудзіла яўна апартуністычную тэорыю правых аб дэградацыі сельскае гаспадаркі, аб неабходнасьці вынізіць тэмп індустрыялізацыі і спараціць будаўніцтва новых саўгасаў і калгасаў. Таму сход заклікае ўсю арганізацыю да яшчэ большай барацьбы з правым ухілам і прымірэнцтвам да яго.

— Сход заклікае арганізацыю да наўхільнага правядзеньня ў жыцьцё ўсіх пастаноў XVI партканфэрэнцыі.

— Сход абавязаў партячэйкі прыняць усе захады да шырокай папулярызацыі пастаноў XVI партканфэрэнцыі сярод беспартыйных рабочых, беднаты, батракоў і серадняцтва.

Як КП(б)Б падрыхтавалася да чысткі партыі

НА ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ НАРАДЗЕ — СТАРШЫНЬ АКК КП(б)Б

Апошняе пасяджэньне нарады было прысьвечана пытаньню аб падрыхтоўцы да чысткі партыі.

Ад партарганізацыі вайсковых часьцей інфармацыю зрабіў тав. Булычэнка.

Падрыхтоўка да чысткі партарганізацыі часьцей ВВА,—сказаў т. Булычэнка,—пачалася ў лютым. На спэцыяльнай нарадзе актыву была прапрацавана дырэктыва ячэйкам аб тым, як праводзіць падрыхтоўку. Усе ячэйкі і палкавыя калектывы дэтальна абгаварылі пытаньне аб чысткі, увязаўшы яго з тэзісамі тав. Яраслаўскага. Характарыстыкі складаюцца на кожную ячэйку ў цэлым, а потым яны сумірюцца і з іх складаецца адна характарыстыка на палкавую партарганізацыю.

Для правядзеньня чысткі ў вайсковых часьцях вылучана 100 лепшых партыйцаў з вялікім партыйным стажам. Акрамя таго вылучана 32 чалавекі ў якасьці тэхнічных працаўнікоў. Каб правядзеньне чысткі не парушкаджала летняй ваеннай вучобе, мы лічым неабходным пачаць яе ў сярэдзіне мая і скончыць прыблізна ў канцы чэрвеня.

Пасьля інфармацыі т. Булычэнка, аб становішчы падрыхтоўкі ў акруговых партарганізацыях зрабілі інфармацыі старшыні акруговых КК.

ПОЛАЦКАЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ пачала падрыхтоўку да чысткі яшчэ з 15-га студзеня г. г. Па вясковых ячэйках і райкомах падрыхтоўчая праца ўжо скончана. Пытаньне аб чысткі абмяркоўвалася на сходах ячэйкі па 2-3 разы.

Аднак, трэба сказаць, што ня ўсюды яшчэ партарганізацыі ўцямілі сабе значэньне і задачы чысткі.

Па гарадох падрыхтоўка некалькі замарудзілася, але і тут яна ў хуткім часе будзе скончана.

Пры падборы кадраў для правядзеньня чысткі мы трапілі на сур'ёзныя перашкоды. З 100 чалавек, якіх вылучылі ячэйкі, пры разглядзе іх складу АКК прышлося пакінуць толькі 25 чалавек. І нават сярод гэтых 25 партыйцаў толькі 3 рабочыя ад варштату. Выходзячы з гэтага, нам прыходзіцца прасіць ЦКК аб прысылцы да нас пэўнага ліку таварышоў для правядзеньня чысткі.

У ВІЦЕБСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ пытаньне аб чысткі партыі абмеркавана шырокай масай партыйцаў. Ячэйкі і партыйныя камітэты разгарнулі падрыхтоўку да чысткі, але ў радзе месц гэта падрыхтоўка вядзецца яшчэ ня досыць уважліва і выстарчальна.

Асабліва дрэнна абстаіць справа з растлумачальнай працай і ўцягненьнем у падрыхтоўчую працу беспартыйнага актыву рабочых і працоўнага сялянства.

Некаторыя райкомы няўважліва адносяцца да складаньня характарыстык, апошнія часта носяць характар агульных разважаньняў і нічога канкрэтнага не гавораць.

Наглядаюцца спробы з боку асобных камуністых захаваць свае антыпартыйныя ўчынкі. Ёсьць таксама і такія, што імкнуцца выкарыстаць чыстку супроць гаспадарнікаў (Вітшвэй, «Мэтпром» і інш.). Беспартыйныя масы рабочых праяўляюць вялікую зацікаўленасьць да чысткі. Большасьць насьценгазэт удзяляюць гэтаму пытаньню шмат увагі. На жаль, і віцебская акруговая «Заря Запада» слаба асьвятляе на сваіх старонках пытаньні чысткі.

Амаль усе ячэйкі БАБРУЙСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ абмеркавалі тэзісы тав. Яраслаўскага.

У вясковых раёнах быў рад выпадкаў, калі пытаньне аб чысткі партыі абмяркоўвалася на закрытых партсходах. Батрацтва і бядняцтва слаба ўцягнуты ў падрыхтоўку да чысткі.

Беспартыйныя масы рабочых актыўна ўдзельнічаюць на сходах, прысьвечаных чысткі, і поўнасьцю ўхваляюць апошнюю. Парткомы, прэса і насьценгазэты ўдзяляюць мала ўвагі чысткі партыі.

За апошні час АКК атрымала 37 заяў ад рабочых, якія выкрываюць антыпартыйныя ўчынкі асобных камуністых. Выявіўся, напрыклад, такі факт, што былы старшыня Клічаўскага РВК, член партыі з 1919 г., служыў у царскай паліцыі на пасадзе памочніка барбуйскага паліцэйстэра. Другі факт: рабочы-дрэваапрацоўшчык, член партыі, пры белапольскай акупацыі служыў у польскай ахранцы.

З другога боку, наглядаюцца асобныя выпадкі, калі некаторыя партыйцы, не чакаючы чысткі, самі выходзяць з радоў КП(б)Б. Адзін член партыі, які 2 разы быў асуджаны за крымінальныя злачынствы, прыслаў у КК свой партбілет з наступным надпісам: «У зьвязку з хваробай прашу выключыць мяне з партыі».

У АРШАНСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ адкрытыя сходы ячэек, прысьвечаныя чысткі партыі, прайшлі пры актыўным удзеле беспартыйных рабочых. Для правядзеньня чысткі мы вылучылі 19 таварышоў, з якіх 13 рабочых, 4 беднякі-сяляне і 2 служачыя. Усе вылучаныя—актыўныя партыйцы і карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод рабочых мас.

У МЕНСКУ падрыхтоўку да чысткі партыі пачалі зараз-жа пасьля XII зьезду КП(б)Б. Усе ячэйкі дэтальна абмеркавалі тэзісы Яраслаўскага. У сходах прыняло ўдзел шмат беспартыйных. У падрыхтоўцы, аднак, наглядаўся рад недахопаў. Частка парт'ячэек абгаворвала пытаньні чысткі на закрытых сходах. Пачалі складаць характарыстыкі, многія з іх насілі яўна склочніцкі характар.

Для правядзеньня чысткі вылучаны 104 партыйцы. Кандыдатуры вылучаных абмяркоўваюцца на партсходах.

У ГОМЕЛЬСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ беспартыйныя масы ўцягнуты ў падрыхтоўку да чысткі. На сходзе партактыву Добрускай фабрыкі прымала ўдзел 900 беспартыйных рабочых. У сходзе парткалектыву чыгуначных майстэрань удзельнічала 1.500 рабочых. Беспартыйныя паказвалі на скажэньні лініі партыі в боку асобных партыйцаў, што асобныя майстры цягнуцца ў хвасьце адсталых рабочых. На адным партсходзе беспартыйныя выкрылі прагульшчыка-камуністага. У радзе ячэек чыстка фактычна пачалася ўжо.

Вясковая беднота таксама дапамагае партыі выкрыць кулацкія антыпартыйныя элемэнты. Актыўнасьць рабочых можна характарызаваць наступным: у некаторых ячэйках, пасьля дакладу аб чысткі, групы рабочых калектыўна падавалі заявы аб уступленьні ў партыю.

Старшыні МАЗЫРСКАЙ і МАГІЛЕЎСКАЙ АКК паказваюць, што ў гэтых акругах падрыхтоўчая работа вядзецца выстарчальна. Характарыстыкі прадстаўлены ўсімі. У камісіі, вылучаныя для правядзеньня чысткі, увайшло 95 проц. рабочых з вялікім партстажам.

Пасьля інфармацыі старшыньн АКК выступіў т. КАЛНІН.

Ня гледзячы на вялікую падрыхтоўчую работу, якая праведзена акруговымі КК, трэба адзначыць,—гаворыць тав. Калнін,—што ідэалёгічная мабілізацыя шырокіх мас навакол чысткі партыі яшчэ слабая.

Наша задача зараз—узмацніць падрыхтоўчую работу як у ідэалёгічным, так і ў арганізацыйным напрамку. Мы яшчэ не дабілісь таго, каб партарганізацыі разумелі розьніцу паміж чысткай партыі 1921 г. і сучасная. Мы маем яшчэ такія выпадкі, калі бытавыя моманты адыгрываюць галоўную ролю пры складаньні характарыстык.

Усе такія недахопы павінны быць зжыты, толькі тады мы зможам практычна прыступіць да чысткі.

Чыстка пачнецца ў чэрвені месяцы.

С. Г—н.

Пастановы XVI партканфэрэнцыі—у масы

КОЖНЫ КАМУНІСТЫ Ў СВАЁЙ ПРАКТЫЧНАЙ РАБОЦЕ ПАВІНЕН ВЫКРЫВАЦЬ АПАРТУНІСТЫЧНУЮ СУТНАСЬЦЬ ПРАВАГА ЎХІЛУ І ПРЫМІРЭНЦТВА

Рэзалюцыя сходу актыву Полацкай арганізацыі КП(б)Б па дакладу тав. Фёдарава аб выніках красавіковага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі.

— Заслухаўшы даклад тав. Фёдарава аб выніках красавіковага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) і XVI партканфэрэнцыі, сход актыву полацкай арганізацыі КП(б)Б цалкам ухваляе пастановы пленуму і канфэрэнцыі, якія вызначылі правільны шлях далейшага сацыялістычнага будаўніцтва.

Сход поўнасьцю далучаецца да пастановы пленуму канфэрэнцыі аб правядзеньні чысткі партыі і савецкага апарату і заклікае арганізацыю сваячасова падрыхтавацца да чысткі і праверкі сваіх радоў.

Сход лічыць, што галоўным абавязкам кожнага камуністага, як і ўсёй арганізацыі ў цэлым, зьяўляецца сыстэматычная барацьба супроць яўна апартуністычнага правага ўхілу і прымірэнцтва.

Сход заклікаў арганізацыю да цьвёрдага і няўхільнага ажыцьцяўленьня пастаноў XVI-й партканфэрэнцыі.

Усебеларуская агітпрапнарада

Аб антырэлігійнай рабоце

ДАКЛАД т. КАРАСЯ

Антырэлігійная прапаганда да апошняга часу не заняла яшчэ належнага месца ва ўсёй сыстэме культурна-выхаваўчай работы сярод працоўных мас.

Барацьба з клерыкалізмам праводзілася заўсёды кампанейскі, галоўным чынам, напярэдадні таго ці іншага рэлігійнага сьвята. Сыстэматычнай, штодзённай работы на антырэлігійным фронце ня было.

У выніку пастаноў XII зьезду КП(б)В аб антырэлігійнай рабоце, апошняя некалькі ажывілася. На мясцох пачалі зьвяртаць больш увагі на саюз «Бязбожнік», наладжваць антырэлігійныя вечары, праводзіць гутаркі на антырэлігійныя тэмы і г. д. За апошнія тры месяцы рады саюзу «Бязбожнік» павялічыліся на 40 тысяч новых членаў.

Аднак, тэмп антырэлігійнай прапаганды нельга лічыць здавальняючым. Дзейнасьць рэлігійных арганізацый, сэктантаў, папоў, рабінаў, ксяндзоў, у зьвязку з наступленьнем на капіталістычныя элемэнты, ажывілася. Асабліва клерыкалы імкнуцца пашыраць свае ідэі сярод сялянства, адсталых груп рабочых і жанчын. І трэба сказаць, што на гэтыя групы ім удаецца рабіць некаторы ўплыў.

Вось чаму партыйныя арганізацыі павінны мабілізаваць усю сваю ўвагу на барацьбу з клерыкалізмам у горадзе і асабліва на вёсцы. Бяз зьнішчэньня рэлігіі задача сацыялістычнага перамаганьня працоўных ня можа быць выканана.

Тав. Карась падкрэсьлівае, што посьпех антырэлігійнай прапаганды будзе забясьпечаны толькі тады, калі ў ёй будуць прымаць удзел прафсаюзы, камсамол, каапэрацыя, МОПР, шэфтаварыствы і г. д.

Зараз перад намі паўстае практычная задача—уцягнуць шырокія масы ў антырэлігійную работу.

Мы павінны павесьці антырэлігійную прапаганду і вярбоўку новых членаў у саюз бязбожнікаў так, каб да канца гэтага году саюз бязбожнікаў БССР меў'ы ня менш 100 тысяч членаў.

У 1930 годзе мы павінны гэту лічбу давесьці да 200 тысяч.

Работніцы і сялянкі слаба ахоплены антырэлігійнай работай.

Трэба стварыць акруговыя курсы прапагандыстых і арганізатараў антырэлігійнай работы.

У заключэньне т. Карась спыняецца на ролі тэатру, кіно і радыё ў правядзеньні антырэлігійнай прапаганды. Белдзяржтэатр павінен уключыць у свой рэпэртуар п'есы антырэлігійнага характару, а Белдзяржкіно—паклапаціцца аб стварэньні ў бліжэйшы час антырэлігійных фільмаў.

НКА павінен паставіць пытаньне аб арганізацыі ў Менску цэнтральнага антырэлігійнага музэю.

Пасьля прыняцьця рэзалюцый па заслуханых дакладах агітпрапнарада закрылася.

С. Г—н.

У фашысцкай Польшчы

Польскія міністры—фабрыканты фальшывак

ВАРШАВА, 6. Нечаканая адстаўка камандзіра корпуса аховы пагранічча генэрала Мінкевіча зрабіла ў палітычных колах вялізнае ўражаньне. Нечаканай аказалася ня толькі сама адстаўка, але і тая форма, у якой яна была праведзена. Газэты паведамляюць, што канцэлярыі штабу корпусу аховы пагранічча апячатаны. Гэта зроблена па загаду Пілсудзкага генэралам Дрэшэрам, выдатным пілсудчыкам. Больш таго, Мінкевіч даведаўся аб сваім звальненьні толькі тады, калі справы штаба, на чале якога ён стаяў, былі ўжо апячатаны. Гэта гісторыя набывае характар сэнсацыі і ў зьвязку з лістом, які Пілсудзкі паслаў прэм'еру Сьвітальскаму з просьбай апублікаваць яго.

Пілсудзкі піша, што ў Польшчы ўжо даўно завёўся звычай, на моцы якога саноўнікі, калі пакідаюць свой пост, забіраюць з сабой і распячатваюць важнейшыя дзяржаўныя дакументы «Пры такой этыцы, — заўляе Пілсудзкі,— дзяржава робіць уражаньне публічнага дому, які да таго-ж яшчэ і збанкрутаваў, і з якога кожны выносіць і хавае ўсё, што ён захоча. Тым самым сьцьвярджаецца, што там «обитель срама».

Далей высьвятляецца, што адзіным чалавекам у Польшчы, які пакінуў свой пост і ня зганьбіў яго, быў сам Пілсудзкі, гэта—калі ён адмовіўся ад кіраўніцтва дзяржаваю. «Але,—гаворыць далей Пілсудзкі,—я быў за гэта пакараны. Мае наступнікі падраблялі маю подпісь і пакралі ня толькі мае паперы, але нават і маю асабістую ўласнасьць».

Ліст падпісаны Пілсудзкім у якасьці ваеннага міністра, з прычыны чаго ён набывае характар дзяржаўнага акту. Ліст гэты па форме і па раздражным тоне напамінае пядаўні, так многа нашумеўшы артыкул Пілсудзкага пра сойм. (ТАСС).

Арышт рабочых спартсмэнаў

ВАРШАВА, 5. У памяшканьні рабочага спартыўнага таварыства «Промень» у Варшаве зроблен вобыск. Усе прысутныя ў памяшканьні рабочыя-спартсмэны арыштаваны па падазрэньні ў прыналежнасьці да кампартыі. («Жэчп»).

Анархія на мануфактурным рынку

ВАРШАВА, 6. У апошнія дні ў Варшаве адбыўся рад канфэрэнцый і пасяджэньняў прадстаўнікоў гуртовых мануфактурных фірм. Камэрсанты-мануфактурыстыя канстатавалі, што становішча на мануфактурным рынку павінна быць ахарактарызавана, як становішча поўнай анархіі. Банкруцтва дробных гандляроў у правінцыі набыло характар эпідэміі. Канфэрэнцыі афіцыйна не ўхналілі ніякіх рэзалюцый адносна сапраўдных прычын крызісу і спосабаў яго ліквідацыі.

Дэманстрацыя карфантыстых супроць ураду

ВАРШАВА, 6. На днях хрысьціянска-дэмакратычная партыя Карфатага склікала ў Катовіцах вялікі мітынг пратэсту супроць намеру ўраду ліквідаваць аўтаномію Сілезіі. (Сілезія, як вядома, мае фактычна не аўтаномію, а адну толькі відаімасьць гэтакай).

Перад тым, як пачаўся мітынг, у залю ўварваліся члены саюзу былых сілезкіх паўстанцаў, каб сарваць дэманстрацыю карфантыстых. Паміж Паўстанцаў і карфантыстымі пачалася бойка. Паліцыя ўмяшалася і забараніла мітынг.

Характэрна, што эндэкі падтрымліваюць пратэст карфантыстых і ставяць уражаньне, што нібы і яны імкнуцца ратаваць сілезкую «аўтаномію» фактычны-ж эндэкі робяць гэта таму, што акцыя Карфантага накіравана супроць сучаснага польскага ўраду.

Тры месяцы крэпасьці за крытыку Пілсудзкага

ВАРШАВА, 4. У адказ на артыкул Пілсудзкага зьмешчаны ў «Глосе Правды» ў пачатку ліпеня мінулага году «Глос Цукровніка»—орган прафсаюзаў рабочых цукравараў—надрукаваў артыкул пад загалоўкам «Перад канчатковым змаганьнем» з крытыкай пана маршала. Рэдактар і аўтар артыкулу былі прыцягнуты да судовае адказнасьці. Варшаўскі акруговы суд 2-га мая засудзіў абодых на 3 месяцы крэпасьці («Раб.»).

Узмоцненае наступленьне Аманулы на Кабул

ТЭРМЭЗ, 7. З наступленьнем вясны і адкрыцьцём горных праходаў упартая барацьба ў Аўганістане значна ажывілася. Хабібула (Бачэ-Сакао), захапіўшы ў працяту зімы Кабул і рад пунктаў паўночна-ўсходніх раёнаў краіны, у апошні час прымушан абараняцца ад энэргічных нападаў пляменьняў адданых Аманулі і Надыр-Хану. Да канца красавіка Аманула згрупаваў у Газьні з боку Кандагару да 10.000 рэгулярных войск і некалькі тысяч байцоў спачуваючых яму пляменьняў і палаў рашучае наступленьне на Газьні-Кабул. Засеўшы ў Газьні з атрадам войск ваенны міністр Хабібулы Пурдэль-Хан быў акружан войскамі Аманулы. Але ў час рашучых дзеяньняў у тылу Аманулы супроць яго выступілі тры пляменьні гільзаеў, якія разбурылі масты ў раёне Мукур (80 кілёмэтраў на паўночны захад ад Газьні) і напалі на тылы Аманулы. Апошні быў вымушан адступіць на поўнач, у раён спачуваючых яму пляменьняў, а таксама перанесьці сваю базу ў вобласьць хэзарыйцаў.

Паводле апошніх даных Аманула павёў наступленьне непасрэдна на Кабул, заняў Пэйхабад (горад у 60 кілёмэтрах на поўдзень ад Кабулу) і разьбіў групу войск Хабібулы ў раёне Газьні. Ужо некалькі дзён ідуць упартыя бае. У даліне Ўргэнта (100 кілёмэтраў на паўночны ўсход ад Кабулу) ідуць бае паміж войскамі Хабібулы і наступаючымі хэзарыйцамі. Вялікі там кіруе бліжэйшы пасрэднік Хабібулы—Сэйд Гусэйн. Група Надыр-Хана, якая заняла Альтымурскі перавал і дасягнула даліны Логар, паводле апошніх вестак была спынена войскамі Хабібулы і вымушана адступіць. Паводле тых-жа даных брат Надыр-Хана шах Махмуд з атрадам у 4.000 чалавек заняў Барахі-Раджан і Шах-Мазар (40 кілёмэтраў на поўдзень ад Кабулу). Становішча ў Кабуле напружанае. Насельніцтва настроена супроць Хабібулы. У зьвязку з гэтым у апошні час робяцца бязупынныя арышты і пакаранні сьмерцю. (ТАСС).

Самалёты перайшлі на бок Аманулы

ТЭРМЭЗ, 7. У зьвязку з узмоцненым насупленьнем Аманулы і Надыр-хана становішча ў Кабуле напружанае.

Сьпешна эвакуюцца сем'і кугістанскіх дзеячоў і каштоўнасьці. У апэрацыях супроць Аманулы і Надыры-Хана ваенная камандаваньне Хабібулы (Бачэ-Сакао) спрабавала скарыстаць захопленыя ім пры заняцьці Кабулу авіяцыйныя сродкі. Аднак, самалёты, што прымалі ўдзел у баявых дзеяньнях, не вярнуліся ў Кабул, а перайшлі на бок Аманулы. (ТАСС).

Работа ангельскіх агэнтаў

ТЭРМЭЗ, 7. Паводле вестак з Кабулу адзначаецца ўзмоцненьне плянамернай дзейнасьці ангельскіх агэнтаў сярод пляменьняў усходніх (Джэлапабад) і і паўднёва-ўсходняй (хост-гардэс) правінцый на адарваньні гэтых правінцый ад Аўганістану і стварэньня з іх «незалежнае дзяржавы». Пацьвярджаецца факт бязупынная забесьпячэньня пляменьняў ангельскай зброяй і баявымі прыпасамі. (ТАСС).

Гэрат зноў у руках Бачэ-Сакао

БАШКА, 8. Паводле атрыманых вестак у Гэраце адбыўся пераварот, зроблены прыхільнікамі Бачэ-Сакао. Губэрнатар гэрацкай правінцыі пакінуў горад, куды ўступілі атрады Бачэ-Сакао. У горадзе напружанае становішча, рынкі закрыты, насельніцтва тэрарызавана. Прыбыўшыя з Гэрату паведамляюць аб канцэнтрацыі адданых Аманулі войск з мэтай ліквідацыі перавароту. (ТАСС).

Абвінаваучы акт супроць імпэрыялісцкіх змоўшчыкаў

Жэнэўская камэдыя скончана. Закрылася 6-ая па ліку сэсія падрыхтоўчай камісіі канфэрэнцыі па разбраеньні, тэй самай канфэрэнцыі, якую Ліга Нацый ўсё зьбірае, але ніяк ня можа сабраць.

Выступленьні старшыні савецкай дэлегацыі, ня гледзячы на некаторую іх стрымманасьць, якая абумоўлівалася спэцыфічнай дыплёматычнай абстаноўкай, выкрылі перад працоўнымі ілжывую дэмагогію жэнэўскага «таварыства аматараў міру», што з году ў год акуратна зьбіраюцца на свае канфэрэнцыі і сэсіі з поўнай і адзінай мэтай—ашукваць працоўных. Бо працоўныя масы ўсё больш адкрыта выказваюць сваё абурэньне палітыкай буржуазіі і яе ваеншчыны. Гэта ўжо пачынаюць улічваць больш дальнабачныя буржуазныя палітыкі.

«Яшчэ перад 1914 годам,—піша былы прадстаўнік Англіі ў Лізе Нацый лёрд Сэсіль, які прымушаны быў пайсьці ў адстаўку.—урадам буйных мілітарысцкіх дзяржаў станавілася ўсё больш цяжка прымушаць свае народы падпарадкавацца паборам людзьмі і грашыма. Агульнае нежаданьне выконваць гэтыя патрабаваньні, відавочна, будзе ўзмацняцца. Ні для кага ня сакрэт, што гэтая акалічнасьць пачынае непакоіць прадстаўнікоў ваенных колаў».

І вось, каб захлёрафармаваць народы і ня даць іх пасьлядоўнаму супраціўленьню перарасьці ў актыўныя формы, з вялікай старанасьцю інсцэнізуюцца адна за аднэй жэнэўскія «действа». Іменна да гэтай катэгорыі «міратворчых гэстаў» адносіцца прапанова прадстаўніка амэрыканскага імпэрыялізму Гібсона, якая зараз рэклямуецца спэкулянтамі ад нацыфізму, як нейкі пачатак чагосьці новага і. г. д. у падобным канжэнскім сьвеце.

Яна зводзіцца да таго, што ПАЗШ прымаюць францускі «прынцып» аб устанаўленьні агульнага танажу для баявых флётаў з разьмеркаваньнем яго па катэгорыях баявых судоў, але з правам паасобных дзяржаў у асобных выпадках перасоўваць танаж з аднэй катэгорыі ў другую.

Толькі шарлатаны макдональдаўскага тыпу, што спэкулююць на псыхалёгіі адсталых рабочых, могуць сьцьвярджаць, што ўсю справу папсавалі адміралы і тэхнічныя экспэрты; у нас-жа, маў, пайшла-б справа паміж палітыкамі.

Якое глупства! Іменна ў палітыцы—у агульна палітычных і эканамічных супярэчнасьцях інтарэсаў ангельскага і амэрыканскага імпэрыялізму закапаны сабака. Вашынгтонскі карэспандэнт «Таймса» ўжо паведамляе, што ПАЗШ зусім згодзяцца на тое, каб пытаньне аб разброеньні, якое перайшло з рук падрыхтоўчай камісіі ў галіну перагавораў паміж урадамі, засталося ў іх руках доўгі час. Паны мілітарыстыя не сьпяшаюцца.

Злосна і ўпарта сабатуючы разбраеньне, яны на ўсіх парах узбройваюцца. І рыхтуючыся да нямінуючай рашучай схваткі, кожны з бакоў сьпяшаецца заручыцца саюзьнікамі. Англія заключыла патаемную ваенную згоду з Францыяй (славуты морскі кампраміс). Цяпер амэрыканскі прадстаўнік у Жэнэве Гібсон спрабуе перацягнуць на свой бок Францыю. Францускія імпэрыялісты і іх польскія, чэха-славацкія і іншыя васалы ў захапленьні —можна без перашкод павялічыць суханземную армію з благаславеньня Лігі Нацый і багатага амэрыканскага дзядзі (тым мацней удар па нямецкіх лёкарністых, якія яшчэ раз адчулі асалоду заходняй арыентацыі).

Уся гэтая рэжысура была-б вельмі эфэктнай, калі-б у самай жэнэўскай залі ў працягу ўсяго спэктаклю ня быў чутны голас, які расказвае аб тым, што адбываецца ў часе дзеі за кулісамі. У сваіх выступленьнях т. Літвінаў крок за крокам выкрываў махінацыі прадстаўнікоў імпэрыялістычных дзяржаў, бязьлітасна зрываючы з іх пацыфісцкія маскі.

Але, ня гледзячы на гэта, буржуазныя дыплёматы, улічваючы гарачыя сымпатыі і вялікую ўвагу працоўных мас Захаду да савецкай дэлегацыі, вымушаны былі цярпець яе прысутнасьць. Абвінаваўчы акт т. Літвінава выкрыў усю падаплёку жэнэўскае змовы супроць міру. («ПРАВДА»).

На канфэрэнцыі па рэпарацыях

Новы мэмарандум Юнга

ПАРЫЖ, 8. Новы мэмарандум Юнга, які зьніжае ўласна рэпарацыйную частку Францыі да 7 мільярдаў марак, Італіі—да аднаго мільярду марак. Англіі да 700 млн. марак, Бэльгіі—да 650 млн. марак і дробных крэдытораў таксама да 650 мільёнаў марак, сустрэў рэзкае супраціўленьне з боку ангельскай дэлегацыі. Спроба Шахта перадаць рэдагаваньне аграворак ангельскаму экспэрту Стэмпу была адхілена саюзьнікамі, якія адмовіліся мець справу з «амэрыканскімі лічбамі і ангельскімі агаворкамі, замест дакладных і вычэрпваючых нямецкіх прапаноў».

Як падаюць вячэрнія газэты, новыя прапановы Юнга стварылі вельмі напружанае становішча на рэпарацыйнай канфэрэнцыі, бо ніхто з краін-крэдыторраў не згаджаецца скараціць свае патрабаваньні. (ТАСС).

ГЕНЭРАЛЬСКАЯ ВАЙНА У КІТАІ

ШАНХАЙ, 7. Вайна паміж гуансійскай і гуандуньскай правінцыямі пачалася. Гуансійскія войскі, скарыстаўшы непадрыхтаванасьць гуандунцаў, уварваліся ў гуандуньскую правінцыю і заняли гарады Францзян, Дэсінь і Такін, што знаходзяцца па Жоўтай раце. Гуансійскае камандаваньне мяркуе заняць Сямсуй і Сугін і павесьці агульнае наступленьне на Кантон. Гуансійскія войскі пасьпяхова ўмацоўваюць гэтыя гарады. Многія кантонскія жыхары пакінулі горад. Жыхары накіроўваюцца ў Гонг-Конг. (ТАСС).

За ўдзел у першамайскім мітынгу—пад суд

НЬЮ-ЁРК, 7. 14 рабочых, арыштаваных на першамайскім мітынгу ў Віфлеем (цэнтр сталеліцейнай прамысловасьці ў штаце Пэнсільванія) аддаюцца пад суд па абвінавачаньні ў «мяцяжы». Сярод іншых быў арыштаваны і абвінавачаецца зараз у «мяцяжы» 14-гадовы хлопчык, якога паліцыя падазрэвае ў распаўсюджаньні сярод школьнікаў першамайскіх адозваў камсамолу.

ПАРТЫЯ І ПРАВЫ ЎХІЛ*)

Ня менш жорсткім нападкам з боку правых падупадае і паліты

Саугас імя 10-годзьдзя БССР

Генэральная лінія

Нарыс Міх. Гольддэрга

СПАТКАНЬНЕ

.... У трэці раз папаткаў Харытон «таварышаў» на балоце. І што гэта яны сабе думаюць? Што ім трэба на сялянскай сенажаці? Ходзяць з нейкімі цацкамі, поркаюцца ў багне, нешта мераюць. Вось і цяпер.... Ссунуўшы на патылічку сваю «форменную» шапку з сінім аколышам, Харытон рашуча ступіў у бок і з купіны на купіну стаў перабірацца да групы неанаёмых людзей, адзетых пагарадзкому.

— Здрасьце,—сказаў ён, падышоўшы ціхэй і выцягваючы з багны левую ногу, чорную па калена.

— Здароў, дзядзька... адкуль?

— З пасёлку «Чырвоная праца». Тутака недалёка.

— Капаць канавы пойдзеш? Хутка наймаць будзем людзей.

— Нашто канавы капаць?

— Асушка балота праводзіцца... чуў? Скрозь будзе асушана....

Харытон памаўчаў, паглядзеў на круглую чырвоную штучку з доўгім шнуром, на рыдлёўкі, на тоўстыя боты людзей. Потым сказаў:

— А што вы з вадой вробіце? Вып'еце, ці што?... Трасцу вы асушыце.

Яшчэ пастаяў і пайшоў. Гнуткая, як цыркавая сетка, зямля гойдалася пад ім. Часам вялічэзная ўздухавіна вырасталa наперадзе і ападала з хрыплым васосам. Зноў, як учора, як тысячы учора назад у паветры нараджаліся і гасьлі кароткія мэталёвыя гукі:

— У... у.... у...

То стагналі ў балоце жабы.

«ХРЫСТОВАЙ НЯДЗЕЛЯЙ»

Чатыры гады прайшлі з таго дня, і тэй зямлі, па якой прабіраўся дзядзька Харытон, ня стала. І ў «сьветлую хрыстову нядзелю» 1929 году Харытон запрог каня і павёз жонку і дзяцей у Сосны, у савецкую гаспадарку імя 10-гіадзьдзя БССР, на вялікае і незвычайнае сьвята.

— «Сукіны сыны—чаго захацелі, таго дабіліся,—гаварыў ён дарогаю жонцы.— От-жа-ж асушылі»...—І ён прыпамінаў даўнейшае Мар'інскае балота пана Агаркава, касьбу, свае чорныя запэцканыя ногі і востры пах зрэзанай атавы. Як даўно гэта мінулася...

Цяпер ён быў на ранейшым балоце. Ён ехаў шырокай і роўнай, як струна, дарогай. Вяліэарныя рыжаватыя прасторы зямлі беглі ў далячыню, разрэзаныя глыбокімі і тонкімі канавамі, у якіх ледзь-ледзь цурчэла вада. Ён увыяжджаў на масткі, перакінутыя праз шырайшыя канавы. Гэта былі дзіўныя новыя рэкі—яны выцягваліся сіняватымі сталёвымі трыкутнікамі і калолі кругавід завостранымі канцамі. Харытон бачыў палянкі ўжо ўзаранай машынай зямлі (роўненькія акуратныя кавалкі лякалі адзін на другім) і кусьцістую цёмнаязёлную рунь авімага жыта.... Ён бачыў усё гэта, пад'яжджаючы да Сосная, перасякаючы спрадвечны балотны прастор, якім апанавалі «таварышы», адзетыя пагарадзкому.

СОСНЫ

Гэтым імем праз'валі невялікую лясістую выспу сярод неабсяжных далячынь Мар'інскіх балот. Сюды дабіраліся толькі на чаўнох. Дзікія гусі і журавы ляталі над выспай, стыхія балота адрасала яго ад сьвету і бараніла ад нянчаднай рукі чалавека. Але чалавек прышоў.

Летам дваццаць шостага году на высьпе упяршыню загучэла сякера цесьляра. Калфонд Наркамзему ўзьвёў тут першыя будовіны для рабочых і тэхнэрсаналу. А да 1929 году выспа Сосны перастала быць выспаю, **бо асушаны амаль усе дзесяць тысяч гэктараў Мар'інскага балотнага масыву.** Так, асушаны. Выпрасталася жалезнай рукой тэхнікі рака Арэса высмоктвае балотную ваду праз густую сетку мэліярацыйных канаў. І сёньня Сосны—цэнтр гіганцкага саўгасу на 4.218 гэктарах, першай гаспадаркі такога тыпу (на балоце) ва ўсім Савецкім Саюзе.

Пятая мая, у «хрыстову нядзелю», у шэры мяккі веснавы дзень карчаватымі палескімі грэблямі цягнуліся ў Сосны сялянскія падводы. Сотні паляшукоў сышліся сюды за дзесяткі вёрст на камсамольскае сьвята першай баразны. Як і Харытон, усе яны не чакалі нічога падобнага. Яны і цяпер ня верылі цалкам у большавіцкае цуда на балоце. Многія з усьмешачкай гаварылі, што «трахцель ня возьме», што «жыта будзе нішчымнае»... Але пейкая сіла аказалася мацней і гэтай усьмешачкі, і векавой традыцыі—і ў першы дзень вялікадня 500 сялян сабралася ў Соснах, каб сваімі вачыма ўбачыць, як будуць выяжджаць на палі саўгасаўскія трактары. Сярод гэтых людзей ня было ніводнага п'янага.

ДРАКОНЫ

За драўляным манежам пачуўся сухі выразны гук—застукала сэрца першага заведзенага матору. І вось з-за павароту выпаўзла жоўтаалапая жывёліна... Запахла бэнзінам... Напаўняючы паветра рэзкім мэталёвым грукатам, выехалі на дарогу адзінаццаць трактараў. Вецер шалёна ірваў чырвоныя флажкі над радыятарамі. Сталёвая калёна выцягнулася па дарозе. Наперадзе ішлі 10 бліскучых амэрыканскіх «інтэрнацыяналаў», 11-тым быў шэры, з раскрытымі жалезнымі вантробамі, «Красный Путиловец».

На «Інтэрнацыяналах» і на «Путиловце» сядзелі хлопцы ў белай спэцвопратцы—камсамольцы-трактарыстыя. А між машынамі мітусіўся каранасты запэмальцаваны чалавечак-мэханік Іткін. Ён крычаў «средняя скорость» і перабягаў ад машыны да машыны, спрытка ўскокваючы на сьпіну трактара... Натоўп сялян ішоў сьледам за машынамі....

— Стары Гардзей праўду казаў,— ціха загаварыў ішоўшы побач са мной дзядзька з Кузьмічоў,—праўду казаў, што па зямлі будуць хадзіць драконы... Вось яны—драконы...

— Заварочвай сьмялей!—закрычаў Іткін,— і адзін за другім трактары перапаўзьлі масток і выехалі на маўклівы прастор асушанага балота.... Пайшлі! Адзін, другі, трэці.... Чацьверты нечакана асеў на бок і сярдзіта закашляў. Да яго падскочыў Іткін і некалькі рабочых саўгасу. Машыну паднялі, і яна, пырскаючы чорнымі камякамі зямлі, пашла сьледам за авангардам калёны. За ёю рушылі астатнія. Поле напоўнілася машынным гулам, які здалёк нагадваў гул уцякаючага цягніка.

У чырвоных талерках дыскавых барон закіпела зямля. Інтэрнацыяналы дыскавалі ўзорнае леташняе восеньню поле. «Путиловец»-жа вёў доўгі высока-калёны расьсявальнік, які роўненька трусіў узораныя скібы калійнай сольлю... Па ўгноенай зямлі зноў пройдуць бароны і апошнім праедзе каток, які стонудовым цяжарам утрамбуе глебу. Тады ўжо тут пасеюць ачышчаны высока-гатунковы авёс.

.... Трактары разьбіліся на пары і роўнамерна заходзілі з канца ў канец. Паўтысячны натоўп людзей згрудзіўся на дарозе і нема сачыў за цудоўнай работай машын. Трактары перачосвалі чорную галаву зямлі.

— І гэх, журавы!—раптам пачуў я за сабой голас. Пасялковец Харытон, той самы, што некалі сказаў «трасну вы асушыце»,—махаў рукой, паказваючы на дзьве чорныя стралы на кругавідзе— Эх, журавушкі! Няма вам больш месца... Тут хлеб будзе расьці!

Чорныя стрэлы гасьлі ў сіняватым тумане.

НОВЫЯ ВЫМЯРЭНЬНІ

У той дзень мне было шкада толькі аднаго. Мне было шкада, што ў гэты момант нельга даставіць у Сосны тых таварышоў, для якіх генэральная лінія партыі ў галіне сельскае гаспадаркі толькі формула. толькі тэзіс. Сюды-б іх, на асушанае воляй пралетарыяту балота, у натоўп беднаты, у завіруху грандыёзнай бальшавіцкай справы!

На працягу трох гадзін 5-га мая трактары забаранавалі і ўгналі 5 гэктараў. На працягу бліжэйшых трох тыдняў будзе апрацавана яшчэ 350 гэктараў. Пасеюць авёс, жыта, канопілі, картопілі, лён.

Досьлед в леташнім надзвычайна ўдалым пасевам вікі (250 пуд. з гэктара), блыскучая практыка менскай балотнай станцыі, добрыя ўсходы азімага жыта,— усё гаворыць ва тое, што былое Мар'інскае балота сапраўды заквітнее каласістай нівай.

Восеньню трактарная калёна ўзьніме 1.050 гэктараў цаліны. Тут вырастуць цагельны і крахмальны заводы, сыраварня, электрастанцыя. Малочная гаспадарка разьлічана на ўтрыманьне паўтары тысячы галоў малочнай жывёлы. Сотні рабочых рук будуць заняты на сьвіной і ільна-алейнай вытворчасьцях. Праз 5 год валавая прадукцыя саўгасу будзе раўняцца 1.839.570 рублёў.... Новыя вымярэньні, новыя маштабы!

Вузкія здаўленыя вымярэньні беларускага Палесься—лес, балота, лес— раптам мяняюцца, калі выяжджаеш на дарогу ў Сосны. Тут нейкая новая геаграфія, пановану збудаваны зямля, неба, прасторы. Такая геаграфія ня можа ведаць іншых лічбаў, іншых маштабаў.

«У ПАРАДКУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА»

Вечарам у Соснах, у драўляным рабочым клюбе кіпеў сялянскі мітынг.

Начальнік калёнізацыйнага фонду Наркамзему т. Трызна гаварыў аб мільёнах людзей і мільёнах рублёў.

Гадамі мільёны беларусаў пакідалі бацькаўшчыну і цягнуліся на далёкі ўсход, за акіян—шукаць «новую зямлю»....

Яны пакідалі краіну, дзе ляжыць 2.600.000 дзесяцін забалочанай зямлі—некранутае чалавекам багацьце. Пралетарская дзяржава ўкладае мільёны рублёў, каб адваяваць гэтыя прасторы для сацыялістычнага будаўніцтва. Сёлета асушан Мар'інскі балотны масыў. І сёлета-ж пачынаюцца дасьледныя працы на Загальскім масыве ў 70 тысяч гэктараў.

Апісваючы мэліярацыйныя работы на Мар'інскім масыве Міхась Зарэцкі з захапленьнем гаварыў аб «фатальнай сіле Беларусі»... Гэта было сказана не аб пралетарыяце, які пачаў гэту грандыёзную справу. Гэта было сказана аб беларускіх балотах. Але рабочыя Сосная ня ведаюць такой «фатальнай сілы». Яны ведаюць канкрэтную мускульную сілу сваіх рук, якою яны перамагаюць стыхію. Яны ведаюць канкрэтную сілу рабоча-сялянскай дзяржавы, якая стварыла саўгас, якая арганізуе вакол саўгасу 10 калектыўных гаспадарак.

І вось што гаварыў на мітынгу таварыш Вайтэнкаў—старшыня цэнтральнага праўленьня батрацкага прафсаюзу:

— Беднякі! Сяляне! Выступайце-ж на барацьбу з батрам і стварайце калектыўныя гаспадаркі... **І ў парадку сацыялістычнага будаўніцтва трактарная калёна выедзе ўзараць вашы палі.**

. . . . . .

Гэтай-жа ноччу ў саўгасе нарадзіліся партыйная і камсамольская ячэйкі.

Сосны, 7 V 1929 г.

Будаўніцтва

З „парадным" будаўніцтвам можна пачакаць

ШТО НАМ ТРЭБА БУДАВАЦЬ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

(У парадку пастаноўкі пытаньня)

На вытворчай канфэрэнцыі працаўнікоў Белдзяржбуду мы даведаліся, што становішча з асноўнымі будаўнічымі матар'ялямі (за выключэньнем цэглы) даволі цяжкое. І Белдзяржбуд пры аб'ёме работ у гэтым годзе на суму 20 мільёнаў руб. ня здолее поўнасьцю разгарнуць усе работы з-за недахвату ў першую чаргу цэмэнту (прыблізна нястача складае 35 проц.). Зразумела, у некаторых выпадках можна было-б замяніць цэмэнт вапнаю, але аказваецца, што і гэтага матар'ялу ў нас не хапае (12 проц.).

Гэта яшчэ ня ўсё—нам нехапае дахавага і гатунковага жалеза, катанкі (для жалеза-бэтонных работ).

Як выйсьці з гэтага становішча? Зразумела, прыдзецца камбінаваць, замяняць адны матар'ялы іншымі. Але ўсяго гэтага мала, гэтымі мерамі не паправіш становішча. І тут выхад заключаецца ў наступным: трэба зрабіць адбор аб'ектаў будаўніцтва гэтага году, аддаўшы перавагу некаторым з іх. Што намечана да набудовы ў гэтым годзе? Мы маем будаўніцтва прамысловае, жыльлёвае і т. зв. «параднае», як напрыклад, банкі, клюбы. Пры гэтым мы агаворваемся, што ў даным выпадку мы пад тэрмінам «парадное будаўніцтва» разумеем ня лішняе непатрэбнае будаўніцтва, а тыя аб'екты будаўніцтва, якія мы можам адкласьці без вялікай страты.

І мы мяркуем, што ў зьвязку з недахватам будаўнічых матар'ялаў, нам трэба ў гэтым годзе адмовіцца ад гэтага парадняга будаўніцтва, адклаўшы яго да будучага году, калі становішча з будаўнічымі матар'ялямі бязумоўна палепшыцца. І нам трэба ў гэтым годзе заняцца ў першую чаргу прамысловым будаўніцтвам, пабудоваю фабрык і заводаў, а потым яшчэ жыльлёвым будаўніцтвам.

Між тым мы бачым зараз у Менску, што працягваюцца работы пачатых летась клюбаў (мэталістых і харчавікоў), для якіх складзены фундаманты і што ўжо вядуцца падрыхтоўчыя работы па закладцы новых парадных будынкаў (дом Дзяржбанку).

Недахват асноўных будаўнічых матар'ялаў, які выкліканы бурным ростам будаўніцтва, пры больш слабым тэмпе разьвіцьця прадукцыі будаўнічых матар'ялаў дыктуе неабходнасьць адбору тых аб'ектаў будаўніцтва, якія трэба ў гэтым годзе пачаць і скончыць начорна, г. зн. падвесьці пад дах. А в пабудовай банкаў, клюбаў і г. д. мы бяз страт можам пачакаць да наступнага будаўнічага сэзону.

Нашым органам, што рэгулююць будаўніцтва, у першую чаргу будаўнічаму камітэту пры Эканомнарадзе, трэба гэтае пытаньне зараз-жа паставіць і тэрмінова вырашыць, даўшы патрэбныя дырэктывы аб адборы аб'ектаў будаўніцтва.

К—ін.

Рыхтуем камандзіраў-будаўнікоў

Шпаркі тэмп разгортваньня нашага будаўніцтва патрабуе ўсё большага павялічэньня колькасьці і паляпшэньня якасьці тэхнічнага пэрсаналу на пабудовах. Калі мы ставім пытаньне аб вылучэньні рабочых ад варштату на гаспадарчую працу, дык гэтае пытаньне мімаволі ўпіраецца ў падрыхтоўку рабочых для падняцьця іх культурнага і тэхнічнага ўзроўню.

Пытаньне падрыхтоўкі ў Беларусі кіруючага складу будаўнікоў, у прыватнасьці малодшага тэхнэрсаналу, зьяўляецца вельмі вострым і павінна заняць галоўнае месца ў плянах бягучага навучальнга году. Бо ў нас на Беларусі амаль што адсутнічаюць установы па падрыхтоўцы дзесятнікаў - будаўнікоў. Мы толькі маем рабочы тэхнікум у Менску з невялікаю колькасьцю слухачоў, там рыхтуюцца дзесятнікі для будаўнічых работ.

Мы ведаем, што рабочыя, асабліва з найбольш перадавых, зараз імкнуцца да набыцьця тэхнічных ведаў. І зацікаўленым арганізацыям, у прыватнасьці ВСНГБ, трэба ўсямерна садзейнічаць у справе падняцьця тэхнічных ведаў сярод рабочых-будаўнікоў з тым, каб і нашыя пабудовы можна было забясьпечыць добрым складам дзесятнікаў.

Саюз будаўнікоў зараз заняўся падрыхтоўкай рабочых для забесьпячэньня бягучага будаўнічага сэзону малодшым тэхнэрсаналам і ў свой час паставіў пытаньне перад будаўнічымі арганізацыямі аб утварэньні кароткатэрміновых курсаў дзесятнікаў-будаўнікоў. І вось пасьля раду цяжкасьцяй удалося адчыніць кароткатэрміновыя вячэрнія курсы дзесятнікаў-будаўнікоў (пэрмінам на 4 м-цы) з колькасьцю 30-ці слухачоў.

Трэба адзначыць, што з боку слухачоў была праўлена вялікая актыўнасьць да заняткаў. У выніку мы бачым наведваньне курсаў на 100 проц. і таксама добрую пасьпяховасьць, ня гледзячы на тое, што курсантам прыходзілася 8 гадзін працаваць на вытворчасьці і 4 гадзіны ўвечары на курсах. Навучальны плян курсаў ужо закончаны і зараз мы выпускаем 30 чалавек дзесятнікаў якраз да пачатку будаўнічага сэзону. Такія кароткатэрміновыя курсы сёлета былі ў некалькіх мясцох Беларусі (у Полацку, Воршы і інш.). Большая частка гэтых курсаў выпусьціла майстроў-дарожнікаў. У Менску былі арганізаваны дзенныя курсы дарожных майстроў з колькасьці 40 чалавек, яны нядаўна ўжо разьехаліся па мясцох.

Першая практыка арганізацыі кароткатэрміновых курсаў па Беларусі зусім сябе апраўдала. Гэту практыку трэба працягваць і ў далейшым, неабходна паставіць зараз пытаньне шырэй з тым, каб утварыць стацыянарныя школы для падрыхтоўкі ніжэйшага тэхнэрсаналу з разьлікам на 1½ гады вучобы.

Г. ФАЛОВІЧ.

Пабудова унівэрсытэцкага гарадку

Частка гарадка будзе закончана да Кастрычнікавых сьвят

Архітэктар Лаўроў паведаміў нашаму супрацоўніку аб ходзе работ на пабудове ў Менску УНІВЭРСЫТЭЦКАГА ГАРАДКА.

— Першыя тры карпусы—мэдычны, **энатамічны, прыродазнаўчы знаходзяцца ў працэсе аддзелкі. У чацьвертым корпусе канчаецца кладка апошняга паверху.**

У галоўным аўдыторным корпусе пачата кладка сьцен першага і другога паверхаў, а таксама пабудова калён у вэстыбюле.

Узмацненым тэмпам ідуць работы па вацяпленьні і вэнтыляцыі. У бліжэйшы час ім манцёраў будзе складаць 50 чалавек. Работы вядзе вядомая маскоўская фірма «Госсантехстрой».

— **Ёсьць упэўненасьць, што 4 першых карпусы будуць скончаны і пераданы для навучальных занятках у дні 12 гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.**

Пачаліся работы па пабудове 3 карпусоў КЛІНІЧНАГА ГАРАДКУ. Зроблена разьбіўка будынкаў, прыступлена да земляных работ, падвозяцца матар'ялы.

Сёлета першыя тры карпусы будуць учарне скончаны.

Пабудова БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ БІБЛІЯТЭКІ здана Гандальстрою. Гарсавет канчаткова замацаваў вучастак для бібліятэкі на рагу вуліц Карла Маркса і Энгельса. Да будаўнічых работ будзе прыступлена ў другой палове мая.

Усяго ў гэтым сэзоне на будаўніцтва па лініі Наркамасьветы адпушчана каля 3.000 000 рублёў.

Непарадкі на будаўніцтве

Аўтарытэтная камісія прымае нягодныя пабудовы

Яшчэ не пасьпелі пабудаваць новы рабочы пасёлак пры торфаводзе «Новая Беларусь» (у 4-х вярстах ад г. Бабруйску), як ён ужо патрабуе рамонту. Расказкам больш падрабязна пра гэту пабудову.

Трэст «Белторф» распачаў работу на пабудове пасёлку яшчэ ў 1927 г. Правядзеньне работ было даручана прарабу тэхніку-будаўніку Гебэрману. Рабілі ўсё з новага лесаматар'ялу. Былі пабудаваны 4 баракі для рабочых, 2 сталоўкі, 2 дамы для абслугоўваючага штату і інш.—усяго да 13 пабудоў. Затрачаныя грошы склалі даволі значную суму.

Пасьля сканчэньня пабудовы для агляду і прыёму пасёлку прыяжджала камісія з Менску ў складзе прадстаўнікоў з ВСНГБ і Белторфтрэсту. Пабудовы былі прыняты з назначанымі напрауками ў складзеным акце.

Але што-ж мы бачым: праз некаторы час зноў прыехаў прараб—дзеля чаго? Рамантаваць толькі што скончаныя новыя пабудовы. Людзі, якія далёка стаяць ад будаўніцтва, бачылі, што рамонт трэба зрабіць, што нешта нядобра, што баракі без ужыцьця мер усе разваліцца. Баракі аселі, сьцены разьехаліся. Выявілася, што ня было скобаў і толькі цяпер маюць намер зьвязаць сьцены скобамі, калі яшчэ знойдуць жалеза.

Мала таго, у новых пабудовах падлогі выпіраюць дугой, у жылых дамах жыць нельга, печы займаюць па паўквартэры. (Гэта, відаць, для эканоміі цэглы!). Лазьня з вадапроводам, а мыцца нельга—верхняя бэлька вось-вось абваліцца. Прараб нанава разабраў падлогі і печы ў лазьні,—відаць яны аказаліся нягодными.

Запытаньне: што-ж прараб глядзеў раней, калі пачынаў будаваць увесь рабочы пасёлак? Ён-жа—тэхнік-будаўнік. Па нашай думцы, кепскі гэта будаўнік, які ў тры разы даражэй будзе нікуды нявартыя пабудовы ды яшчэ з дадаткам 7-8 тысяч рублёў на рамонт.

Трэба знайсьці канкрэтных вінаватых ва ўсіх гэтых непарадках і ўсе страты спагнаць з іх, а ў далейшым не дапускаць іх да будаўнічых работ.

ІДЗІН.

ГРОШ ЦАНА НАСЬЦЕНГАЗЭЦЕ, ЯКАЯ НЕ ЗЬЯУЛЯЕЦЦА МАСАВАЙ

АРГАНІЗАЦЫЯ МАС ДЛЯ РАШУЧАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ СУПРОЦЬ НЕДАХОПАУ ВЫТВОРЧАСЬЦІ І АПАРАТУ, ДЛЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА—ВОСЬ АСНОУНАЯ ЗАДАЧА НАСЬЦЕНГАЗЭТ У ДВУХТЫДНЁВІК ДРУКУ НАСЬЦЕНГАЗЭТЫ ПАВІННЫ УЗМАЦНІЦЬ СВАЮ СУВЯЗЬ З МАСАМІ

РАСПУШЧАНА РЭДКАЛЕГІЯ НАСЬЦЕНГАЗЭТЫ ХЛЕБАЗАВОДУ

Адсутнасьць масавай работы, боязьнь самакрытыкі, дрэннае кіраўніцтва рабкорамі—прымусіла бюро парт'ячэйкі ўхваліць пастанову аб пераабраньні рэдкалегіі

Грош цана гэтай газэце, бо вакол яе рэдкалегія ня здолела арганізаваць масы. Завод налічвае да 200 рабочых. Ці-ж нельга было арганізаваць гурток рабкораў, хоць-бы з 15 чалавек? Можна было, але ня было ніякой спробы гэта зрабіць.

Больш таго: няма абсалютна ня толькі ўліку матар'ялу і актыўных рабкораў, але нават уліку саміх членаў рэдкалегіі.

Быў выпадак, калі расьсьледваньне заметкі аб прыходзе п'яным на работу аднаго майстра было даручана былому члену партыі, чорнарабочаму, **які залежаў ад гэтага майстра.** І што-ж? Зьмяшчаецца абвяржэньне, а актыўны рабкор, член партыі, атрымлівае ад бюро ячэйкі вымову за паклёп у друку. А праз некаторы час высьвятляецца, што майстар сапраўды прыходзіў на работу п'яным, ды нават ня раз.

Члены рэдкалегіі ня прыцягваліся да выданьня насьценгазэты. Адзін з членаў рэдкалегіі падаў нават заяву з просьбай зьняць з яго годнасьць члена рэдкалегіі, бо ніякай работы яму не даручаюць і ён нават ня ведае, калі выходзіць газэта.

Рэдкалегія не праводзіць масавай работы. Таму амаль усю газэту запаўняе адзін рэдактар. «Ільлічоўка», што выдаецца, фактычна зьяўляецца плякатнай газэтай, бо матар'ял у ёй зьмяняецца адразу ўвесь, ці ў значнай частцы. Таму нярэдка ў ёй можна ўбачыць матар'ял ужо даўно прайшоўшай кампаніі, які страціў усякую надзеннасьць.

Ня сочыць рэдкалегія і за тым, што ўжываецца па заметках, зьмешчаных у газэце. Часамі адміністрацыя фармальна адпісваецца.

Жыцьцё цукерні, якая абслугоўваецца адным заўкомам і ячэйкай, газэта амаль не асьвятляе.

Былі выпадкі, калі рэдактар газэты ў голас заяўляе: «на адміністрацыю я пісаць ня буду, я яе баюся, у мяне ёсьць жонка і дзеці, я есьці хачу» і г. д. Аднойчы, перад вытворчай нарадай булачнага цэху, у якім працуе рабкор апошні папярэдзіў аднаго, які рыхтаваўся выступіць з крытыкай таварыша «ад імя цэху», што калі ён штонебудзь на нарадзе скажа супроць булачнікаў, дык яны склікаюць сход цэху і паставяць пытаньне аб выгнаньні таварыша з заводу.

Гэтыя і рад іншых фактаў прымусілі бюро парт'ячэйкі ўхваліць пастанову **аб пераабраньні рэдкалегіі.**

Рабочыя павінны абраць у рэдкалегію такіх таварышоў, якія-б сьмела і адкрыта пачалі барацьбу з усімі непарамальнасьцямі на заводзе.

С. Х.

Больш масавасьці!

Раскіднасьць Менскага працкалектыву пекароў ва ўсіх канцох гораду, трохзьменная работа—перашкаджаюць нармальнай работе насьценгазэты: цяжка зьбіраць рабкораў, ня ўсе рабочыя пасьпяваюць прачытаць насьценгазэту.

Склад рэдкалегіі нездавальняючы: ня ўсе члены рэдкалегіі прымаюць актыўны ўдзел у работе насьценгазэты, на сходы гуртка рабкораў члены рэдкалегіі часта ня прыходзяць. Бывае і так: абвяшчаеш члену рэдкалегіі, што заўтра пасядзяньне, а ён адказвае: «Ідаі ты, ведаеш куды?..»

Некаторыя члены рэдкалегіі не ўсьвядомілі сабе значэньня самакрытыкі. У зьвязку з гэтым заўважваецца некаторы зажым. У работе насьценгазэты няма масавасьці, таму за апошні час менш стала паступаць матар'ялу.

Адміністрацыя яшчэ не ўсьвядоміла сабе задач насьценгазэты на вытворчасьці і таму на заметкі не рэагуе.

Адсутнасьць масавасьці ў рабоце насьценгазэт прыводзіць да таго, што рабочыя не разумеюць значэньня насьценгазэты і глядзяць на яе, як на страшыдла, а на рабкораў,—як на «неспакойных» людзей. З гэтае-ж прычыны няміначы такія выпадкі, якія мелі месца 18 сакавіка, калі рабочы Слоўіч сарваў лісток насьценгазэты, дзе былі зьмешчаны дзьве заметкі аб яго хуліганскіх «пахаджэньнях» на вытворчасьці.

Адсутнасьць работы сярод рабкораў прыводзіць да таго, што рабкоры дрэнныя і гэта перашкаджае рабоце рэдкалегіі.

Работу рэдкалегіі трэба зрабіць больш масавай.

ГРЫНЦВАЙГ.

Супроць бюракратызму і фармалізму

Як працуе насьценгазэта „Чырвоны страхавік"

Насьценгазэта дзяржстраху ўвесь свой агонь накіравала. галоўным чынам, на выяўленьне ўсіх балячак дзяржапарату і зьнішчэньне бюракратызму.

Як канкрэтна газэта выконвала гэтыя задачы?

Возьмем пытаньне па павышэньні **працоўнай дысцыпліны.** Тут барацьба разгарнулася з канкрэтнымі выпадкамі. Вось карыкатура на 6 таварышоў, якія зрабілі пасяджэньне шэфтаварыства ў часе работы. А вось сьпіс таварышоў, якія спазьняюцца на работу.

Вядзецца барацьба са «страшэннай бегатнёю», курэньнем, непатрэбнымі для справы тэлефоннымі гутаркамі і інш.

Бюракраты, валакітчыкі, якія за паперкай ня бачаць жывога чалавека, жывой справы, займаюць «пачэснае» месца ў газэце. Насьценкоры выкрываюць «гульню адказных». Два адказныя супрацоўнікі, сталы якіх стаяць адзін супроць другога, перапісваюцца паміж сабою, ходаюць у рэгістратуру гэтыя лісты нумараваць і г. д.

Бічуецца перапіска паміж праўленьнем і Менакрстрахам, якія знаходзяцца ў адным памяшканьні, пад адным дахам.

Рабкоры асьвятляюць бюракратычныя, фармальныя і нядбайныя адносіны да работы супрацоўнікаў. Тут і брашуры коштам у 100 руб., якія рассылаюцца праз год пасьля таго, як яны атрыманы. Тут і апэрацыйная справаздача Дзяржстраху за 1926-27 г., якая друкуецца ўся на расійскай мове, а вокладка на беларускай.

Не абмяжоўваючыся барацьбою з унутранымі бюракратамі напае ўстановы, рабкоры пачалі выводзіць на верх бюракратаў, якія сядзяць у Маскве—у Галоўным Праўленьні Дзяржстраху СССР. Вось нядаўна было **асьветлена ў газэце запатрабаваньне** галоўнага праўленьня аб тым, каб прысылаць ім копіі прапоўных сьпісаў нашых адказных супрацоўнікаў. Для якой мэты—адзін алах ведае. Копію зьмешчанага ў насьценгазэце артыкулу накіравалі ў РСІ БССР, якая напісала ў РСІ СССР аб тым, каб зрабіць уплыў на цэнтральных дзяржстрахаўскіх бюракратаў.

Праз насьценгазэту ўзьнята пытаньне аб скасаваньні для служачых савецкіх устаноў **разрахункових кніжак.** Наркампрацы БССР прызнаў, што гэта думка правільная і будзе абгаворана Наркампрацы СССР.

Насьценгазэтай праароблена вялікая праца па рэжыме эканоміі і рацыяналізацыі апарату. Рабкоры даюць цэлы рад прапаноў па паляпшэньні яго работы.

Паводле прапаноў, зьмешчаных у насьценгазэце, якія абгаворваліся на эканомкамісіі—сабрана і перадана папяровым фабрыкам каля 200 пудоў папяровае макулятуры.

Праведзена ў жыцьцё прапанова аб увядзеньні ў акруговых агэнцтвах кніг прапаноў, заўваг і скаргаў.

Рацыяналізаваць, спрашчаць работу— аб гэтым крычыць рабкор. Ён патрабуе больш гібка скарыстоўваць функцыянальную сыстэму, г. зн., каб адказны працаўнік, які атрымлівае 160 рублёў, не займаўся-б сшываньнем абежнікаў для рассылкі на месцы

Ён патрабуе зьнішчэньня розных непатрэбных пасад (экспэдыцыя па ліквідацыі страт і тарыфазнаўца), **зьнішчэньня расьпісак па страхаваньні** жывёлы, плацежных лістоў па асабістым страхаваньні, скасаваньня кантролю асабістага страхаваньня, скасаваньня агульнага кантролю страхаваньняў ад пажару, зьмяншэньня працы экспэдыцыі, скасаваньня непатрэбнага вусім пратакаляваньня некаторых пытаньняў праўленьня.

Усе гэтыя пытаньні знаходзяцца ў стадыі «выраішэньня». Праўда, нельга іх так хутка вырашыць, але трэба, каб усе гэтыя вельмі карысныя прапановы хутчэй правесьці ў жыцьцё, бо дадуць яны шмат эканоміі дзяржаве.

Як бачыце, пытаньні па рацыяналізацыі апарату, зьніжэньні яго недахопаў займаюць значнае месца ў насьценгазэце. З 330 артыкулаў (за 4 месяцы) 50 проц. прыпадаюць спэцыяльна на гэтую тэму. Праект далейшай рацыяналізацыі апарату асьвятляўся ў спэцыяльным бюлетэні, выпушчаным насьценгазэтай. Былі і прапановы з боку рабкораў.

Газэта стала штурхачом і ў рабоце ўстановы, і таксама ў рабоце ўсіх грамадзкіх арганізацый, сувязьзаю з РСІ, «Зьвяздою», НКПрацы, саюзам і іншымі ўстановамі. Артыкуламі, карыкатурамі лёзунгамі і масавымі сходамі, адкрытымі пасяджэньнямі рэдкалегіі насьценгазэта ахапіла сваім уплывам увесь калектыў, усё яго жыцьцё.

Насьценгазэта сапраўды робіцца арганізатарам мас служачых да сацыялістычнага будаўніцтва.

РАБКОР.

Лебядзіная песьня насьценгазэты Гандальбуду

Аб тым, як працавала насьценгазэта Гандальбуду і ў якіх умовах ёй прыходзілася працаваць, ня раз пісалася ў газэце «Зьвязда». Умовы былі вельмі цяжкія. Не сустракаючы ніякага падтрыманьня з боку мясцовых арганізацый і калектыву, рэдкалегіі прыходзілася амаль самой запаўняць насьценгазэту матар'ялам.

Зразумела, калі супрацоўнік дазваляе сабе сказаць наконт насьценгазэты, што «яе трэба выкінуць вон», калі добрыя, мэтазгодныя мерапрыемствы з боку рэдкалегіі бязьлітасна зрываюцца (зрыў лекцый, суду і інш.), то ня дзіва, калі работа насьценгазэты наогул кульгала.

Перад двухтыднёвікам друку ўсе рэдкалегіі насьценгазэт на мясцох падагуляць сваю работу за год і зробяць належныя вывады. Што робіцца ў гэтай галіне насьценгазэтай Гандальбуду. Абсалютна нічога. Ды яе фактычна і няма зусім. «Чырвоны Прамень» больш ня існуе. 8-га сакавіка быў выпушчаны апошні нумар насьценгазэты, прысьвечаны выключна міжнародняму дню жанчын і... баста. Гэта была, як гаворыць, яе «лебядзіная песьня». На гэтым скончылася жыцьцё насьценгазэты Гандальбуду. Жаночы нумар, які быў вывешаны ў сакавіку месяцы, так і застаўся вісець, і можна быць упэўненым, што будзе вісець і далей без усялякіх зьмен. Зразумела, ніякіх дакладаў, справаздач і чаго-небудзь іншага адносна дня друку ня было.

Можна сабе праставіць удзел грамадзкіх арганізацый у насьценгазэце пры такім фінале... Вельмі сумна, але факт застаецца фактам.

Г. ДОРСКІ.

Зьдзекуюцца з рабкораў

У апошні час насьценная газэта фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» (Мазыр) стала выходзіць рэгулярна кожны месяц. Павялічыўся лік рабкораў да 40 чал., насьценгазэтаю пачалі вельмі цікавіцца. Але ў рабоце рэдкалегіі ёсьць значныя недахопы.

Сама рэдкалегія на сваім складзе (7 чал.) непрацаздольная, бо выбары праходзілі **казённа** і працуюць над насьценгазэтаю толькі 2-3 чал.

Бюро ячэйкі КП(б)Б і заўком на рабкораўскую работу ўвагі не зварачаюць.

Работа з рабкорамі не праводзілася: за ўвесь час праведзена толькі адна нарада рабкораў, на якой прысутнічала 7 чал. Калі просіш заўком—«дайце нам дзень для правядзеньня нарады», атрымліваеш адказ—**«усе дні заняты».**

На зьмешчаныя заметкі слаба рэагуюць. Рабкорам гаворыць: «вам рабіць няма чаго, дык вы пішаце ў газэту».

А сакратар яч. ЛКСМ дагаварыўся, што «рэдкалегія заметкі на членаў бюро ЛКСМ павінна перадаваць на разгляд на бюро, а потым друкаваць у газэце».

І калі была зьмешчана заметка на члена бюро яч. ЛКСМБ, напісаная групаю камсамольцаў, дык гэты член бюро брыдка аблаяў рэдкалегію. А сакратар лішучаму гэтыя радкі заявіў, што «вы разлагаеце бюро яч. ЛКСМ».

ПЧОЛКА.

2 пляны і абодва на паперы

Ня гледзячы на тое, што рэдкалегія склала два пляны (агульны і каляндарны) работа ні па адным пляне не праводзіцца.

Так, напрыклад, паводле каляндарнага пляну намечаны антывялікодная і першамайскія кампаніі і двухтыднёвік друку

Па Савецкай Беларусі

Закрыўся зьезд прафсаюзаў Бабруйшчыны

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Закрыўся 5 акруговы зьезд прафсаюзаў Бабруйшчыны. Зьезд прыняў рад пастаноў аб паляпшаньні прафсаюзнай працы на фабрыках і заводах. У прэзыдыум новага акрпраффбюро абрана 13 чал., за старшыню абраны тав. Эстрын.

Распачаўся „дзень лесу"

БАБРУЙСК. (Наш кар.). «Дзень лесу» ў Бабруйскай акрузе распачаўся 20 красавіка. Праводзіцца вялізарная работа на пасеве, пасадцы і замацаваньні лесу ад сыпучых пяскоў і ачыстцы лясных плошчаў.

Уся гэта работа праводзіцца з шырокім удзелам насельніцтва пад непасрэдным кіраўніцтвам лясных спэцыялістых.

За двухтыднёвы тэрмін па акрузе будзе праведзена лесакультурная работа на плошчы ў 50 гэктараў, пасеян лес на плошчы 173 гэктараў. Намячаецца ў працягу гэтага часу закласьці лясныя гадавальнікі на плошчы ў 2.800 кв. мэтраў, падрыхтаваць пад пасеў лесу плошчу ў 70 гэктараў, ачысьціць лес ад гальля на плошчы ў 3.100 гэкт., праводзіць абсадку вуліц, дарог.

Побач з гэтым вядзецца сярод насельніцтва растлумачальная праца аб значэньні і захаваньні лесу.

6 мая «Дзень лесу» быў праведзен у Бабруйску. Абсаджваліся дрэвамі вуліцы, звыш 1.000 дрэў пасаджана ў вайсковым гарадку. Пасьля працы адбыўся мітынг, на якім прымала ўдзел звыш 3.000 чалавек.

Ч.

Аздараўленьне работы на фабрыцы „Гэрой Працы"

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). На фабрыцы «Гэрой Працы» ў Добрушы адбыўся значны пералом у працы. Партарганізацыя энэргічна праводзіць у жыцьцё мерапрыемствы, намечаныя ЦК КП(б)Б і АК. Норма выпрацоўкі даходзе 47-48 тон замест ранейшых 37. Па некаторых цэхах зусім няма прагулаў. У гэтых цэхах самі рабочыя выносяць грамадзкае ганьбаваньне прагульшчыкам.

Палепшылася і масавая работа на фабрыцы. Праца клюбу прыстасоўваецца да пасобных груп рабочых. Узмоцнена інтэрнацыянальнае выхаваньне.

Аўтарытэт партыйнае арганізацыі расьце. За апошнія 2-3 месяцы ў партыю ўступіла 25 чал. пераважна з вялікім вытворчым стажам.

Невыкананьне лесазагатоўчых плянаў

ВОРША. (Наш кар.). Ня гледзячы на тое, што з боку акруговых кіруючых органаў былі прыняты належныя меры для ўзмацненьня лесазагатовак, планы па лесазагатоўках яшчэ і да гэтага часу ня выкананы. Некаторыя лесазагатоўчыя арганізацыі выканалі планы вырубкі будаў нічога лесу, але не правялі загатоўкі дроў, а другія загатовілі матар'ялы, ды ня вывезьлі іх. Так, Магілёўскае аддзяленьне Лесбелу загатоўку дроў выканала толькі на 13 процантаў, а вывазку на 23 проц. На больш на адну трэць выкананы лесазагатоўкі МБВ чыгункі і Полацкім аддзяленьнем. Па некаторыя лясьніцтвы і лесазагатоўчыя арганізацыі справы перададзены ў РСІ.

Кулацка-папоўская шайка выкрыта

М. ХАЛОПЕНІЧЫ. (Наш селькор.). Папу вёскі Гольдзьберг, Халопеніцкага раёну Дзейку Харлампу не спадабалася, што пры правядзеньні землеўпарадкаваньня ў мінулым годзе забралі ў яго частку зямлі, якою надзялілі батрака Чарвякова і калгас «Серп».

Кабгадамсьціць за гэта, Дзейка з сваёю жонкаю і сынам Сымонам напаілі пастуха Іванова, які падпаліў будынкі Чарвякова.

Пакончыўшы з бедняком Чарвяковым, Дзейка пачаў вясьці агітацыю сярод сялянства в. Гольдзьбер за разгон калгасу «Серп».

Яго падтрымалі кулакі Купчынаў і Дзейкаў, ад якіх таксама была забрана частка зямлі. Гэтыя кулакі разам з падкулачнікамі Бабехіным і Восіпавым згаварыліся зрабіць напад на старшыню калгасу тав. Самсонава. Тут яны зноў зьвярнуліся за дапамогаю да пастуха Іванова і дакляравалі яму за забойства Самсонава 30 руб., калі-ж Іваноў на гэты раз выканаць волю кулакоў не згадзіўся, тады яны пачалі пагражаць сябром калгасу забойствам, калі яны ня выйдуць з калектыву і не пачнуць вясьці сваю гаспадарку ранейшым спосабам.

М.

З-за галавацяпства дарожнай адміністрацыі

М. БЯРЭЗІНА. (Наш кар). Паводкаю зьнесло мост на рацэ Брусяты, каля вёскі Зьмітравічы, Бярэзінскага раёну. Каб былі прыняты своячасова меры з боку дарожных майстроў і адміністрацыі і былі разьбіты крыгі лёду, якія затрымліваліся каля мосту, то мост уцалеў-бы. Але дарожныя работнікі зьявіліся тады, калі мост ад моцнага напору лёду быў ужо разбураны.

М.

1-шы ўсебеларускі зьезд хірургаў і гінэкалёгаў

Пазаўчора ў клюбе імя Леніна адкрыўся першы ўсебеларускі зьезд хірургаў і гінэколёгаў. На зьезд зьехалася 150 дэлегатаў ад розных навуковамэдыцынскіх арганізацый і таварыстваў.

Адчыніўшы зьезд, Нарком аховы здароўя т. Барсукоў адзначыў вялікае значэньне хірургіі і гінэкалёгіі ў савецкай мэдыцыне.

Гэты зьезд—кажа т. Барсукоў,—як і цэлы рад іншых спэцыяльных мэдыцынскіх зьездаў, выяўляецца дзіцём Кастрычнікавае рэвалюцыі. Савецкая ўлада прымае ўсе меры для разьвіцьця мэдыцыны і са здавальненьнем адзначае посьпехі савецкай мэдыцыны за апошнія некалькі год.

Хірургія і гінэкалёгія мае важнае значэньне ва ўмовах вёскі, якая адчувае асаблівую патрэбнасьць у мэдыцынскай дапамозе.

Ад імя арганізацыйнага камітэту зьезду і навуковага таварыства менскіх дактароў зьезд вітаў праф. Рубашоў, ад імя Беларускага Дзяржаўнага універсытэту—праф. праф Пічэта і Кроль, ад бабруйскай асацыяцыі дактароў—д-р Морзан, ад Чырвонае арміі—нач. санітарнай часткі БВА—т. Пшанічны.

У прэзыдыум зьезду абраны прафэсары Рубашоў, Выдрын, Сакалоўскі, Кроль, д-ры Марзан, Абрамовіч, Вялічка. Абрамянц, Шапіра і інш.

Пад гучныя воплескі дэлегатаў зьезду, у ганаровы прэзыдыум абіраюцца т. т. Сталін, Рыкаў, Гамарнік, Васілевіч, Чарвякоў, Галадзед, Баліцкі, Ігнатоўскі, Пічэта і Барсукоў.

На першым пасяджэньні зьезду, якое адбылося сумесна з дэлегатамі зьезду вучастковых дактароў, былі заслуханы даклады д-роў Шапавалава, Морзана, Фурса, Трамповіча і Абрамовіча аб становішчы хірургічнай і гінэкалёгічнай дапамогі ў БССР і пэрспэктывах разьвіцьця гэтай дапамогі паводле пяцігодкі.

Зьезд атрымаў прывітальныя тэлеграмы ад раду мэдыцынскіх устаноў, доктарскіх асацыяцый і ад пасобных выдатных прадстаўнікоў мэдыцыны.

Учора зьезд вылучыў дэлегацыю для прывітаньня IX ўсебеларускага зьезду саветаў.

Для дэлегатаў зьезду адкрыта выстаўка па пытаньнях артапэдыі і радыеляченьні.

Г. С.

Праф. Кроль—старшыня ўсесаюзнага камітэту па скліканьні сусьветнага кангрэсу наўрапаталёгаў

У 1931 годзе ў Бэрне (Швэйцарыя) склікаецца сусьветны кангрэс наўрапаталёгаў. У кангрэсе прымуць удзел выдатнейшыя наўрапаталёгі Эўропы і Амэрыкі. Кожная краіна вылучае арганізацыйныя камітэты па падрыхтоўцы скліканьня кангрэсу.

Дэкан мэдфаку БДУ, праф. КРОЛЬ вылучаны старшынёй усесаюзнага арганізацыйнага камітэту па падрыхтоўцы скліканьня кангрэсу. Намесьнікам яго вылучаны акадэмік ПАЎЛАЎ.

Ці патрэбна будаваць кіно-фабрыку?

Адказ на артыкул т. Чыжэўскага

Зусім слушна, што наогул «мільёны нам вельмі патрэбны», але яны патрэбны і на нашае культурнае будаўніцтва, бо да гэткай справы трэба падыходзіць не з буржуазна-дзяляцкага пункту гледжаньня, які сабе ўсвоіў тав. Чужэўскі, а «крышку шырэй»—з пункту гледжаньня інтарэсаў сацыялістычнага, камуністычнага будаўніцтва. Паклаўшы ў аснову погляд т. Чужэўскага, мы-б дайшлі да скасаваньня выдаткаў на шмат якія з нашых культурных патрэб. Напрыклад, выдаткі на тэатры. Якая патрэба рыхтаваць улаўныя артыстычныя сілы, калі ёсьць сотні здольнай артыстычнай моладзі ў РСФСР, якія атрымалі вывучку і могуць быць выкарыстаны з некаторымі выдаткамі на вывучэньне імі нацмовы. Да таго-ж ня намажа «камэрцыйнае адзінаборства» з расійскай культурай весьці.

Але-ж гэта вы, т. Чужэўскі, навязалі Белдзяржкіно нейкую ахвоту «камэрцыйнага адзінаборства» з Саўкіно, бо ў вас над усім пануе гэта тыпова буржуазная «деляческая точка зрения» і гэткаю толькі меркаю вы вымералі пытаньне аб пабудове Белдзяржкіно самастойнай у БССР кіно-фабрыкі, на 12-м годзе існаваньня савецкае ўлады ўсё яшчэ не разумеючы, што культурныя патрэбы працоўных мас здавальняюцца без «камэрцыйнага адзінаборства» між саюзнымі рэспублікамі, а пад лёзунгам «дагнаць і перагнаць» перадавыя капіталістычныя дзяржавы, як гэта дакладна зазначыў і наказаў нам У. І. Ленін.

На гэтай асноўнай памылцы пабудавана ўся фальшывая «крытыка» А. Чужэўскага, якая ў дадачу кульгае яшчэ на абедзьве нагі і ў іншых меркаваньнях, хаця для т. А. Чужэўскага была магчымасьць некалькі месяцаў вывучаць дзейнасьць Белдзяржкіно.

Ці патрэбна шырока разгортваць кіно-вытворчасьць?—Так, патрэбна—адкажам мы.

Кіно-фабрыка Белдзяржкіно ставіць фільмы на іншыя (не нацыянальныя толькі) тэмы зусім ня з прычын, што нібы ёй ужо цяпер «не хапае нацыянальных тэм», а з меркаваньняў палітычнага і мастацка-культурнага парадку («не замыкаючы сваю вытворчасьць выключна ў мясцовыя тэмы, а распраўляць фільмы і на агульна-саюзныя і сусьветныя тэмы», як кажа пастанова СНК БССР ад 9-III—1929 г.).

Дарэчы аб тым, што «не хапае нацыянальных тэм». Беларускіх і наогул мясцовых тэм хапае і будзе хапаць, але сцэнарны крызіс ляжыць ня ў тэмах, а ў апрацоўцы тэм і яго перажывае нават Саўкіно, бо дасягнуўшы пэўнай ідэалёгічнай і мастацкай вышыні, савецкая кіно-вытворчасьць хоча не задавальняцца «заурад»-сярэднім фільмам, а шукае высока апрацаваных тэм.

База—у якасьці пракатнай тэрыторыі.

Тое, што зараз Саўкіно выкарыстоўвае сваё манапольнае становішча ў галіне кіно-пракату—няправільна і нац. кіно-арганізацыі дасягнуць устанаўленьня нармальных умоў рэалізацыі свае прадукцыі. Зарукай гэтага зьяўляецца ўжо заснаваньне агульна саюзнага кіно-камітэту, які і прызваны рэгуляваць усялякія падобныя пытаньні. У запасе ёсьць і дырэктыўныя інстанцыі.

Падлічэньні сум рэалізацыі фільмаў т. Чужэўскі робіць наўгад, і таму кажаць, што яны «паступова падаюць» занадта рана, да таго-ж трэба дадаваць, што дзьве першыя фільмы Белдзяржкіно рэалізаваны ўжо з пакрыцьцём ня толькі панесеных выдаткаў, але ў сярэднім, з 86,8% чыстых прыбыткаў. Прагэта-ж т. Чужэўскі набраў у рот вады, каб умацаваць сваё лёгкаважкія і катэгарычныя прароцтвы пра вытворчасьць, якая яшчэ дагэтуль ня скончана рэалізацыяй.

Далей, у т. Чужэўскага зноў ідзе выразка «на кофейной гуще».

«К канцу 5-годкі... фільмы Белдзяржкіно з тэрыторыі РСФСР будуць выцесьнены»... Адкуль гэта ўзята? Са столі ўласнага пакою, з неба?.. «Удумкі» крытык, бачыце, зусім ня ўлічвае таго росту культурных патрэб працоўных мас, вынікам якіх зьяўляецца і зараз ужо бурны рост кіно-сеткі. Апошняя к канцу пляніраемага пяцігодзьдзя вырасце надзвычайна і вось у гэтым задавальненьні нябачных раней патрэб і ляжыць гарантыя росту савецкай кіно-вытворчасьці. Праз некаторы час патрэбна будзе рэгуляваць гэтае пытаньне праз кіно-камітэт, але гэта справа далейшых, а ня першага пяцігодзьдзя.

Рэалізацыя фільмаў за межамі дагэтуль дала ўжо каля 6.800 р. валюты і паколькі яна не вымагае ад нас ніякіх дадатковых выдаткаў пры выпуску фільм, чаму-ж нам у гэтым губіць усялякія «ілюзіі на посьпех». Мы большыя аптымістыя ў ацэнцы савецкае кіно-вытворчасьці тым больш, што для гэтага, паўтараем, ня трэба рабіць ніякай «устаноўкі» на выдаткі.

Мы пакідаем т. Чужэўскаму яго выдумку, як «думка Белдзяржкіно аб шырокім разгортваньні кіно-вытворчасьці ў мэтах камэрцыйнага адзінаборства з «Совкино» на рынку СССР» таксама, як і яго сьцьвярджэньне, што «праект пабудовы кіно-фабрыкі носіць характар камэрцыйнага прадпрыемства»—хай ён іх праверыць сам для сябе пад кутом погляду патрэб росту беларускай і іншых нацкультур БССР і знойдзе нашыя, савецкія аргументы супроць пабудовы кіно-фабрыкі ў БССР.

Нам. Заг. Белдзяржкіно

Я. ДЫЛА.

Пастанова бюро скаргаў НК РСІ Бел. аб становішчы ў НКСЗ і акрсабеза

(Да вынікаў „налёту" на ўстановы)

1. Канстатаваць, што факты, выяўленыя пры налёце і асьвятленыя ў друку адносна працы НКСЗ і акрсабезу—у асноўным пацьвердзіліся:

а) у рабоце акрсабезу ёсьць неналаджанасьць прыёму і няўважлівыя і грубыя адносіны да наведвальнікаў;

б) адзначыць адсутнасьць культпрацы ў доме інвалідаў, засьмечанасьць складу жыхароў дому, у выніку чаго маюцца выпадкі п'янства, хуліганства і інш.

2. Прыняць да ведама паведамленьне НКСЗаб. т. Масальскага, што справа аб загадчыку дамамі інвалідаў т. Тананушкіну перадана пракурору Менскай акр. і што робіцца праверка сацыяльнага складу інвалідаў інвалідага дому.

3. Лічыць, што ўмовы працы акр. аддз. сац. забясьпекі і НКСЗаб. бязумоўна цяжкія і цэлы рад недахопаў тлумачыцца аб'ектыўнай абстаноўкай.

4. Лічыць абвінавачваньне т. Масальскага і Адзінцова ў праяўленых грубасьцях да наведвальнікаў недаказаным, але-ж зьвярнуць увагу т. Адзінцова на няўважлівыя адносіны з яго боку да наведвальнікаў.

5. За меўшыя месца грубыя адносіны ў працы, а таксама з рабочымі абсьледвацелямі НК РСІ пры налёце з боку інспэктара акр. аддз. сацзабясьпекі—т. Бэранчыка—паставіць яму на від.

Прапанаваць яму палепшыць прыём наведвальнікаў у акрсабезе і павесьці рашучую барацьбу з вымагальнікамі і дэклясаваным элемэнтам, якія дазарганізуюць працу акрсабезу.

6. Прасіць МК акрсабезу праверыць сапраўднасьць вышэйчанай заметкі ў газэце «Рабочий» аб т. т. Нячаеву і Гутэрману.

Рыхтуйце шофэраў, а ня змазчыкаў

У задачу аўтакурсаў уваходзіла даць добрых шофэраў і тэхнікаў нашаму аўтатранспарту. У працэсе работы курсаў выявілася, што аднаго году для вучобы мала, прыбавілі яшчэ паўгода, і зрабілі выпуск. Але што-ж? Некалькі новых спэцыялістых-тэхнікаў працуюць у гаражы аўтаўправы... змазчыкамі, некаль'кі чалавек у тым-жа гаражы зьяўляюцца сьлесарамі, тры чалавекі ў пажарнай камандзе памочнікі-шофэраў і ўсяго толькі адзінкі працуюць у Менску і па акругах за шофэраў.

Аб якасьці работы гэтых новых шофэраў гаварыць не прыходзіцца. Яна зусім дрэнная. Новыя шофэры ня ўмеюць абыходзіцца з машынаю і ніраваць ёю. Гэтыя факты сьведчаць, што аўтакурсы за паўтара гады ня толькі не здолелі выканаць овае задачы і даць аўтатранспарту добрых тэхнікаў, але нават не змаглі даць больш менш добрых шофэраў.

Таму я ўношу прапанову: Аўтадору ўзгадніць з Наркамасьветы пытаньне аб адкрыцьці ў Менску не гадовых курсаў, а трохгадовай прафшколы з аддзяленьнямі: шофэраў, трактарыстых-мэханікаў і аўтатэхнікаў, пры чым тэрмін навучаньня аўтатэхнікаў павінен быць максымум 3—4 гады, для шофэраў—2—2 з пал. гады і для трактарыстых—1 з пал. 2 гады. Тэрмін вялікі, але вопыт аўтакурсаў паказаў, што за паўтара гады ня толькі аўтатэхніка, але нават больш менш здавальняючага шофэра падрыхтаваць нельга. Гэтая школа павінна быць арганізавана накшталт аўташколы ЦУМТ'у у Маскве.

В. НАВІЦКІ.

Павялічыць загатоўкі насеннай бульбы

На сваім апошнім пасяджэньні праўленьне Белсельсаюзу адзначыла, што акруговыя сельсаюзы ня выканалі пляну загатовак насеньня для веснавой сяўбы. Праўленьне Белсельсаюзу зьвярнулася да акруговых РСІ з просьбай высьветліць прычыны невыкананьня пляну загатовак насеньня і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

Акруговым сельсаюзам даручана пад іх адказнасьць ужыць рашучыя меры да выкананьня загатовак і адгрузкі бульбы для Полацкай і Віцебскай округ. Аб ходзе загатовак і адгрузкі бульбы акрсельсаюзы павінны паведамляць Белсельсаюзу кожныя 5 дзён.

Адначасова з тым, праўленьне Белсельсаюзу адзначыла, што масавыя наезды ў БССР прадстаўнікоў іншагародніх арганізацый для куплі бульбы ставяць пад пагрозу выкананьне загатоўчага пляну.

Разам з тым, праўленьне Белсельсаюзу ўзьняло перад Эканомнарадам БССР хадайніцтва аб вызваленьні сыстэмы сельска-гаспадарчай кааперацыі ад загатоўкі бульбы для прамысловасьці ў зьвязку з перагружанасьцю апарату Белсельсаюзу.

59 гаспадарак атрымалі дапамогу ад рабочых

Рабочыя завода «Чырвоны Кастрычнік» (г. Воршы) арганізавалі суботнік на карысьць вясковай бедноты. На атрыманыя грошы было закуплена 29 плугоў, якія праданы камітэту ўзаемадапамогі падшэфнай вёскі. Акрамя таго адрамантавана 17 сялянскіх плугоў. У выніку 59 бяднацкіх гаспадарак атрымалі рэальную дапамогу ад рабочых.

Патрэбна толькі, каб беднота адпаведным чынам скарысталь гэту дапамогу.

Пабудуем самалёт і танк

Рэдкалегія насьценгазэты КАМВУЗУ імя ЛЕНІНА (Менск) ад імя рабкораў і чытачоў уносіць на пабудову самалёту «РАБСЕЛЬКОР» і танку імя М. І. УЛЬЛЯНАВЫ дадаткова 30 рублёў 85 кап. (усяго ўнесена 196 рублёў 5 кап.).

ЗБОР СРОДКАЎ ПРАЦЯГВАЕЦЦА.

Усіх выкліканых («Зьвязда» № 69) просім пасьпяшацца з уносам сродкаў.

* * *

Па выкліку насьценгазэты МАЗЫР. АВК рэдкалегія насьценгазэты ВІЦЕБСКАГА АВК ад імя рабкораў і чытачоў уносіць 55 рублёў 90 кап.

МАЗЫРАН, ЯКІЯ НАС ВЫКЛІКАЛІ, ПРОСІМ УНЕСЬЦІ РОЗЬНІЦУ ДА НАШАЙ СУМЫ.

* * *

Рэдкалегія заводу «ПАСТАЛЫ» (Мазыршчына) ад імя рабкораў і чытачоў уносіць 17 рублёў 15 кап.

* * *

Рэдкалегія МЯСЦКОМУ СУВЯЗІ (Гомель) уносіць 4 руб.

У прэзыдыуме горсавету

— ЛАЗЬНЯ Ў ЛЯГЭРАХ. Прэзыдыум гарсавету адпусьціў №-скаму падшэфнаму палку 3.000 рублёў на пабудову ў лягэрах лазьні.

— ПЕРАДАЧА ДАМОЎ ЖАКТ'ам. Гарсавет вывучае пытаньне аб мэтазгоднасьці перадачы ўсіх камунальных дамоў ЖАКТ'ам. Акрпляну даручана ў 10-ці дзённы тэрмін сабраць адпаведны матар'ял.

ЗЬВІНІГАРА
Лепшы савецкі фільм

Да ведама сялян-хадакоў

Цэнтральны Дом Селяніна спыніў сваю працу па аболугоўваньню сялян-хадакоў начасам на час з 7-га па 15-е траўня г. г. у зьвязку з тым, што Інтэрнат ЦД Селяніна заняты дэлегатамі 9-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў.

У гэты час будзе праводзіцца ў Цэнтральным Доме Селяніна толькі юрыдычная і агранамічная кансультацыі.

МЕНСК

Справаздачы Наркамасьветы на фабрыках і заводах

Па прапанове бюро ячэйкі, Наркамасьветы ў бліжэйшыя дні наладзіць на фабрыках і заводах Менску—на «Бальшавіку», заводзе «Энэргія», у чыгуначнікаў рад справаздачных сходаў. На гэтых сходах адказныя працаўнікі Наркамасьветы, т. т. Баліцкі, Слонім, Мазур і інш. выступяць з дакладамі, у якіх яны асабліва спынуцца на пытаньнях інтэрнацыянальнага выхаваньня ў школах сацыяху, прафтэхнічнай асьветы і інш. Саддаклады зробяць кіраўніці пасобных навучальных устаноў БДУ, політэхнікуму. Сходы будуць аболугоўвацца мастацкімі сіламі.

Курортныя вагоны

З 31 МАЯ пачнуць курсаваць курортныя вагоны.

АДПРАЎЛЕНЬНЕ вагонаў МЕНСК—СЭВАСТОПАЛЬ штодзённа а 8 гадзіне раніцы; МЕНСК — ЭЎПАТОРЫЯ—штодзённа-а 8 гадзіне раніцы; МЕНСК—МІНЭРАЛЬНЫЯ ВОДЫ з 1 чэрвеня чаотва тры разы ў тыдзень—па аўторках, чацьвяргох і суботах а 8 гадзіне раніцы; МЕНСК—АДЭСА—штодзённа а 12 гадзіне 47 хвілін ночы.

ЗЬВІНІГАРА
Лепшы савецкі фільм

За дзень

— ПЛЕНУМ БЕЛБЮРО ЧЫГУНАЧНІКАЎ. 25 мая ў Менску склікаецца чарговы пленум Белбюро ЦК чыгуначнікаў. На абвесткі дня: даклады аб выніках абсьледваньня прафработы на транспарце Беларусі, аб мерапрыемотвах па падняцьці вытворчасьці працы.

— РАСТРАТЧЫКА—ВОН З САЮЗУ. За растрату прафсаюзных грошай выключаны з саюзу харчавіковы б. старшыня заўкому працкалектыву пекароў Гарэлік.

— ЖЫЛЬЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА Ў САЎГАСАХ. Белсельтрэст сёлета будуе ў саўгасах Беларусі 21 новы дом для рабочых. На гэтую мэту адпушчаецца 251.000 рублёў. 150.000 рублёў будзе адпушчана на рамонт дамоў у 77 саўгасах.

— С.-Г. КУРСЫ. Белсельтрэст правёў рад курсаў па падрыхтоўцы кіраўнікоў саўгасаў, калгаснікаў, трактарыстых і г. д. Усяго праз гэтыя курсы сёлета прапушчана 368 чалавек. Апрача таго праз вячэрнія курсы ў 58 саўгасах прапушчана каля 700 рабочых.

— МАСАВЫЯ ПАХОДЫ Ў ЛЯГЭРЫ. У зьвязку з надыходзячым выхадам падшэфнай часьці ў лягэры саюз харчавікоў пастанавіў правесьці рад вечароў на карысьць падшэфнікаў. У перыяд лягэрнага збору будуць наладжаны масавыя паходы рабочых у лягэры.

Адчыненьне летняга сэзону

12 мая адбудзецца ўрачыстае адчыненьне летняга фізкультурнага сэзону. Арганізуецца масавая дэманстрацыя, у якой прымуць удзел 3.000 фізкультурнікаў. На спорт-пляцоўцы арганізуюцца таварыскія спатканьні футбалістых, баскетаалістых і лёгкіх атлетаў

Паведамленьні

— У пятніцу 10-га і ў панядзелак 13 мая 1929 г. адбудзецца заключная заняткі і выдача характарыстык у вячэрняй савецкай партыйнай школе. Прыйсьці ўсім слухачам.

— КЛЮБ ІМЯ КАРЛА МАРКСА. Сёньня кіно «Цырк Помэра». Пачатак а 7 з пал. і 9 з пал. гадз. увеч.

Выкліканцы 1-я дружына парадку.

А 8 гадзіне—заняткі струннага аркестру.

У ВЫПАДКУ
НЕАКУРАТНАЙ
дастаўкі газэты
„ЗЬВЯЗДА"
званеце па тэл.
2-49

БІБЛІЯГРАФІЯ

А. Оршын. «Цяжкія роды». Выданьне БДВ. 1929 г., 3.000 экз. Цана 85 к., стар. 94.

У цяжкіх пакутах нараджаецца новае жыцьцё вёскі. Каранёвы аджываючага цесе на сялляліся паміж сабою і моцна яшчэ трымаюцца на цёмных кутках Беларусі.

Кніжка А. Оршына першая ў нашай літаратуры так некрава малюе жыцьцё вёск і змаганьне ў ёй новага са старым.

На шостым годзе рэвалюцыі з фронту, дзе абараняў краіну саветаў, вярочаецца дамабілізаваны Ігнат Вэрчык да хаты.

У гэты час вёска Загор'е заліваецца самагонам: мокнуць старыя, разгульвае моладзь. Хочуць цягнуць у гэта чорнае мора разгулу і Ігната, але не дзеля гэтага атрымліваў Ігнат гарт у войску, каб так лёгка здацца ў лапы цемры.

Шырокае поле дзейнасьці адчыняецца для Ігната. На другі фронт, фронт культурнае перабудовы вёскі ідзе Ігнат разам з камсамольцамі і сьвядомаю часткаю моладзі.

Цяжка спачатку працаваць Ігнату. Руку заможнае часткі падтрымлівае мясцовая ўлада. Дома пачынаюць асуджваць палітыку Ігната. Хочуць жаніць яго на Надзьвы Ляшчук, дачцы заможнага сялянина.

На сходзе пры ўручэньні акладных лістоў расшыфроўваецца махінацыя старшыні сельсавету з заможнаю часткаю.

За справу расьсьлехваньня бярэцца Ігнат.

— Дарэмна!.. Дарэмна, кажу, мужыкоў ты баламуціш. Што табе лезьці ў гэтыя справы? Каб ня ты, набрахалі-б ды супакоіліся. Ня першы раз—радзіць Ігнату Ляшчук. Але ня тое зусім гаворыць Ігнатава сумленьне.

Разгортваецца самая што ні ёсьць шырокая барацьба на ідэалёгічным фронце.

Па заслугах атрымлівае старшыня сельсавету Верамейчык, а на яго месца абіраецца Ігнат. Сяло расколваецца на дзьве часткі.

Ігнат усё глыбей і глыбей акупаецца ў грамадзкае жыцьцё: змагаецца з самагонам, клапоціцца аб культурным становішчы вёскі, дбае аб выдаленьні сялян у камуну.

Ня так лёгка гэта даецца ўсё, як мы ведаем. Так яно паказана і ў аповесьці. З боку заможнае часткі пачынаецца помста на Ігната і камсамольцаў за такія мерапрыемствы.

Толькі ўпартаю працаю, вытрымаласьцю—даводзіць да канца сваю справу Ігнат: у Загор'і арганізоўваецца камуна.

«Сёньня падкладаюць першую цагліну пад будынак новага жыцьця. Кідуць у новае...—кажа аўтар аб камунарах.

Так, сёньня падкладаюць цагліну пад будынак новага жыцьця ня толькі ў Загор'і, але і яшчэ шмат дзе па Саюзе. Сьмела, упарта ідзе ў наступленьне новае на старое, на аджытае.

Напісана аповесьць надзвычайна лёгкаю, дынамічнаю моваю, даюцца досыць мастацкія зарысоўкі.

Аўтарызаваны пераклад з расійскага выканан добра, за выключэньнем некалькіх слоў, якіх можна было ўхіліцца (газарэ, абырае). Таксама вельмі ўжо ўлюбёнымі сказамі зьяўляюцца ў творы такога гатунку параўнаньні:

— Пыхае жаробкай Гануля. Ня двёўка, а конь. Жарабцамі рагаталі Бубны, што пры ўяўленьні паказваецца вельмі грубо.

Да недахопаў у самым творы траба адзначыць, што Ігнат, самы цэнтральны герой аповесьці, выведзен нацягнута, у жыцьці яно бывае трохі інакш. Таксама з вобразкам самагонкі ў папа—здаровае нятыповае, калі і было дзе ў сапраўднасьці.

Досыць тыпова перадаюцца разважаньні сялян аб рэлігіі, бальшавікох, падатку і той час.

У творы аўтар паказаў свае знаёмства з жыцьцём і бытам вёскі, што і робіць твор цікавым.

Бязумоўна, кожны, хто цікавіцца тым, што творыцца на вёсцы, павінен прачытаць гэту кніжку.

Тэхнічна кніжка выдана ня зусім добра. Ёсьць шмат характарскіх памылак. Ня зусім ухачна дана і назва, якая больш пераносіць да назвы з мэдыцынскага жыцьця.

Ал. Витрэ.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

РАДЫЁ
ВАСКНА. 22. 23-ія кросьвёкі. в 8-й гал. раніцы. у Ленінградзкай зоне Вышэйшага Крамлёўскага дакладу выбуховы адкрываюцьі 16-ая ўсесаюзнай партканфэрэнцыі.
Па 40-м шкале аўтора. 70 Ленінскі 1924 г.

ЗЬВЯЗДА
Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Шчырэтнацкай Падпіскі (С) Беларусі.
Орган рэвалюцыйнага і Менскага Камітэтаў дзеячоў літаратурнага мастацтва Б. С. С. Р.
Бо Вярхоўнай Радзе набудзецьі фіф рыне літаратурнае мастацтва
Бо ЦК КПБ Б-ЛКСМ
Бо ЦК КПБ Б-ЛКСМ
Бо ЦК КПБ Б-ЛКСМ